Гайнаўшчына ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Новы войт Чаромхі ☞ 4

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 50 (2848) Год LV | Беласток, 12 снежня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Аляксей МАРОЗ

ДАМОВА АБ ПРЫГРАНІЧНЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

У сядзібе Белавежскага нацыянальнага парку 3 снежня адбылося IX пасяджэнне Польска-беларускай падкамісіі па справах прыгранічнага супрацоўніцтва ў рамках Польска-беларускай міжурадавай каардынацыйнай камісіі, якое закончылася падпісаннем пратакола-дамовы аб супрацоўніцтве ў каардынацыі дзейнасці розных служб у выпадку надзвычайных сітуацый на прыгранічнай тэрыторыі, узаемным інфармаванні па пытаннях знаходжання грамадзян у суседняй дзяржаве ў рамках спрошчанага прыгранічнага руху і былі прыняты рашэнні па справах аховы асяроддзя. Пагадненне аб малым памежным руху паміж Польшчай і Беларуссю ратыфікаваў ужо польскі парламент, яшчэ летам падпісаў прэзідэнт РП Браніслаў Камароўскі і ад гэтага часу чакае яна ратыфікацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

фота Наталлі Герасімюк

Пратакол-дамову IX пасяджэння Польска-беларускай падкамісіі па справах прыгранічнага супрацоўніцтва падпісалі намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь Валянцін Карпіцкі (справа) і падляшскі ваявода Мацей Жыўна

Людзі чакаюць спрошчанага прыгранічнага руху

— Удзельнікамі пасяджэння вызначана неабходнасць хутчэйшага ратыфікавання пагаднення аб спрошчаным памежным руху і трэба спадзявацца, што гэты працэс з беларускага боку не будзе доўгім, а ў бліжэйшым часе пагадненне будзе прад'яўлена прэзідэнту, — сказаў „Ніве" намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь Валянцін Карпіцкі, які ўзначальваў беларускую дэлегацыю. — Карысць ад пагаднення будзе ўзаемнай, таму што здымаюцца бар'еры і спрошчваюцца працэдуры перасякання мяжы. Гэта несумненна аблегчыць магчымасць сустракацца сем'ям, якія жывуць па абодвух баках мяжы, спрычыніцца да часцейшага перамяшчання жыхароў прыгранічных тэрыторый за мяжу, што можа дапамагчы вырашыць некаторыя эканамічныя і сацыяльныя праблемы, якія тычацца прыгранічнага насельніцтва і будзе таксама мацней замацоўваць сяброўства паміж нашымі ваяводствамі і вобласцямі.

Жыхары, якія прынамсі тры гады жывуць на тэрыторыі да 30 кіламетраў ад польска-беларускай мяжы, як з аднаго, так і з другога боку, змогуць без віз, на падставе спецыяльных дазволаў, якія будуць каштаваць 20 еўра, пераязджаць праз мяжу на працягу пяці гадоў і гэтага з нецярплівасцю чакаюць як жыхары прыгранічнай зоны ў Польшчы, так і ў Беларусі. Зараз вядома таксама, што калі нават невялікая частка гміны ўваходзіць у зону шырынёй 30 кіламетраў ад мяжы, то ўсе жыхары гэтай гміны будуць маглі карыстацца прывілеямі, якія гарантуе малы памежны рух. Падляшскі ваявода Мацей Жыўна не выключае магчымасці пашырэння прыгранічнай зоны так, каб у ёй апынуліся жыхары Беластока, але на гэта павінна быць згода еўрасаюзных улад.

— Хацелася б адваяваць для жыхароў Беластока некалькі кіламетраў для малога прыгранічнага руху і ўсё яшчэ перад намі. Маюць жа яны таксама сем'і ў Беларусі, — гаварыў падляшскі ваявода Мацей Жыўна, які, як прадстаўнік урада, ўзначальваў польскую дэлегацыю. — Аблягчэнні ў прыгранічным руху спрычыняцца да перамяшчання вялікай колькасці людзей праз мяжу і гэта ўжо ад іх будзе залежаць, якое гэта будзе мець уздзеянне на гандаль і гаспадарку, ці культурнае развіццё гэтых тэрыторый.

У Польшчы мяркуецца, што кожны год каля ста тысяч людзей па абодвух баках граніцы будуць хадайнічаць за дазволамі на перасячэнне мяжы. Прыгранічны рух апраўдаўся ў выпадку польска-ўкраінскай мяжы.

З міжнародным разбудаваным пагранпераходам у Полаўцах

Падляшскі ваявода Мацей Жыўна лічыць, што супольныя дзеянні ў напрамку разбудовы пагранпераходу ў Полаўцах і пераўтварэнне яго ў абсталяваны па-сучаснаму міжнародны пагранпераход гэта таксама будзе ў нейкай ступені рэзультат працы польска-беларускай падкамісіі.

— Відавочным прыкладам нашага ўдалага супрацоўніцтва з'яўляецца разбудоўванне ў рамках польска-беларуска-ўкраінскай праграмы пагранпераходу ў Полаўцах як з польскага, так і з беларускага боку. Выкуплены ўжо тэрыторыі пад новую інвестыцыю, выкананы праекты і вядуцца працы ў напрамку разбудоўвання пагранпераходу з абодвух бакоў. Дзякуючы таму, што мы пастаянна размаўляем у нашай падкамісіі, маглі падрыхтаваць супольную ініцыятыву ў адносінах да гэтага пагранпераходу, здабыць вялікія сродкі на інвестыцыі і гэтым самым абагналі мы разбудову пагранпераходаў на польска-ўкраінскай мяжы, бо там абодва бакі выступалі за сродкі на розныя пагранпераходы, — сказаў падляшскі ваявода Мацей Жыўна. — Плануем таксама супрацоўнічаць з мясцовымі ўладамі, каб аднак у Такарах быў адкрыты турыстычны пагранпераход. Аднак гэта залежыць таксама ад беларускага боку, а ў гэтай справе пакуль пануе там цішыня.

Падкамісія будзе працаваць надалей

— За тры гады, калі дзейнічае наша падкамісія, удалося вырашыць канкрэтныя праблемы, якія тычацца служб аховы асяроддзя, выратавальных служб і служб парадкавага характару ў рамках затрымлівання злачынцаў. Праца нашай падкамісіі вельмі марудная, але ліквідуе фармальныя перашкоды дзеля ўдалага прыгранічнага супрацоўніцтва. Паслядоўнасцю нашай працы з'яўляюцца супольныя абучэнні нашых і беларускіх служб, дзе абменьваюцца яны працэдурамі і стандартамі выратавальных дзеянняў, а прадстаўнікі розных служб знаёмяцца паміж сабой, каб магчы больш удала супрацоўнічаць. Сёння мы адзначылі, што супрацоўніцтва паміж нашымі і беларускімі службамі выходзіць на штораз вышэйшы ўзровень, — гаварыў падляшскі ваявода Мацей Жыўна.

У ліку праблем, якімі будзе надалей займацца польска-беларуская падкамісія, між іншым пытанні экалагічнага характару.

— Важным з'яўляецца выпрацаванне ў галіне экалогіі адзінага погляду наконт захавання водных басейнаў у памежнай тэрыторыі, бо цяпер наш падыход да гэтай праблемы розніцца. Нам трэба таксама дапрацаваць працэдуры больш спрошчанага перасякання граніцы выратавальнымі службамі, якія знаходзіліся б бліжэй непрадбачаных здарэнняў, дзе пацярпелі б людзі, — заявіў міністр Валянцін Карпіцкі і дадаў, што ёсць яшчэ іншыя пытанні, якія польска-беларуская падкамісія будзе абмяркоўваць. Чарговае, дзесятае, пасяджэнне запланаванае на май 2011 года на Гродзеншчыне, паколькі адбываюцца яны наперамен у Польшчы і Беларусі.

9 770546 196000

Зламаць сцэнарый

Кампанія па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выходзіць на фінішную прамую. Не тое, каб гэтая дыстанцыя была марафонскай, хутчэй наадварот, яна нагадвала кароткія адрэзкі забегаў. Кароткі час на агітацыю і сустрэчы з выбарцамі, кароткі час выступаў кандыдатаў у радыё і тэлеэфіры, кароткія і халодныя, па-сапраўднаму зімнія дні. Усё ж наколькі дзяржаўная ўлада краіны не любіць не толькі апазіцыі, але і ўсяго народа, калі прызначае выбары ў такую пару года! А што калі будзе другі тур? Людзям давядзецца ісці і галасаваць у навагодне-калядныя святы! Зрэшты, другога туру ўлада не дапускае нават у думках. Яна ўжо абвяшчае нейкія планы на новую „пяцілетку". У яе ўжо ўсё вызначана, распісаны ўвесь сцэнарый гэтага спектакля — ажно да падліку галасоў і абвяшчэння вынікаў. Пытанне да апазіцыйных кандыдатаў на пасаду прэзідэнта — ці здолеюць яны паламаць гэты ганебны, фальшывы сцэнарый і абараніць выбар людзей. Адзіныя (!) тэледэбаты паказалі, што яны на гэта здольныя. Бадай упершыню апазіцыйныя кандыдаты глядзеліся зладжанай камандай і гэта быў абсалютна правільны шлях, каб супольна зламаць той сцэнарый, які рыхтавалі на гэтай сустрэчы „журналісты" з беларускага тэлебачання. Уладзімір Някляеў увогуле, выступіўшы свае паўтары хвіліны, заклікаў грамадзян прыйсці на плошчу 19 снежня, каб абараніць выбар народа, пасля чаго пакінуў тэлестудыю. Тэледэбатаў сапраўды не было, бо „гарант Канстытуцыі" на іх не прыйшоў, таму фактычна не было з кім дыскутаваць. Аляксандр Лукашэнка ўжо даўно лічыць сябе вышэй усіх, недасягальным прарокам і правадыром адначасна, Богам і нават вышэй яго. Дыскутаваць публічна ён папросту баіцца, ён прывык да доўгіх маналогаў у эфіры беларускіх тэлеканалаў, запаўняючы сабой і сваёй хлуснёй гэты эфір цэлымі гадзінамі.

Вядучыя спрабавалі сутыкнуць кандыдатаў паміж сабой, пасварыць і зрабіць балаган, але іх спробы былі абсалютна нікчэмнымі і праваліліся. Можна сказаць, што кандыдаты выйгралі гэты бой эфектным тэхнічным накаўтам. Бальшыня з іх скарысталася сітуацыяй і заклікала выбарцаў па-першае, не ісці на датэрміновае галасаванне, па-другое, прыйсці ў галоўны дзень на плошчу. Так зрабілі Андрэй Саннікаў, Мікалай Статкевіч, Яраслаў Раманчук, Віталь Рымашэўскі. Моцна і трапна ў шэрагу выпадкаў выказаліся таксама Рыгор Кастусёў, Віктар Цярэшчанка і Дзмітрый Ус. І нават лаяльны да вярхоўнай улады Аляксей Міхалевіч быў змушаны ў такой сітуацыі сказаць нешта апазіцыйнае.

Так званыя тэледэбаты насуперак падрыхтаванаму ўладнаму сцэнарыю сталі першай маленькай перамогай дэмакратычных сіл. Радыкальней іншых падчас адведзенага кандыдатам прамога эфіру выглядаў Мікола Статкевіч, які падчас усіх сваіх выступаў звяртаўся да нязменнага кіраўніка дзяржавы надзвычай востра, адмыслова на „ты" і не называючы яго імені. Як кажуць, яго ж салам па ягонай скуры мазаў. Урэшце ён наўпрост заявіў: „Лукашэнка сёння — гэта камень на дарозе, які трэба прыбраць!". Запомніўся гледачам і Андрэй Саннікаў з яго заклікам „Пара мяняць лысую гуму!". Беларускіх выбарцаў зараз чакае няпростае вызначэнне — можа ўпершыню пасля 1994 года сапраўды ёсць з каго выбіраць, за каго ўсё ж аддаць голас. Але гэта не адзіны і не галоўны выбар. Галоўны выбар — гэта ісці ці не ісці, ехаць ці не ехаць на плошчу, каб абараніць свой грамадзянскі выбар, стварыць нацыянальную салідарнасць, згуртавацца вакол апазіцыйных лідараў. А ў сяброў камісій іншы маральны выбар — лічыць галасы сумленна, ці, як ужо звыклася цягам астатніх псеўдавыбараў, фальшаваць бюлетэні і вынікі, маўчаць ці не маўчаць пры гэтым. Сітуацыя дорыць Беларусі рэдкі шанц вярнуць краіну ў рэчышча законнасці, праўды і справядлівасці. Але для гэтага патрэбна зламаць падрыхтаваны подлы сцэнарый канчатковай узурпацыі вярхоўнай улады. І тады беларусы ўрэшце заслужаць і спраўдзяць адвечнае памкненне „людзьмі звацца".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Каянне экзекутара

25 лістапада ў беластоцкім Цэнтры імя Людвіка Заменгофа адбылася дыскусія на тэму кнігі Стэфана Домбскага „Egzekutor". Кніга з'яўляецца запісам успамінаў выканаўцы смяротных прыгавораў падпольных акаўскіх судоў. Мяркую, што гэтакі ажыятаж у Беластоку выкліканы ўнікальным агульным зместам кнігі, бо самі падзеі ў ёй апісаныя адбыліся далекавата ад нас, на Жэшаўшчыне.

Крыху слоў пра аўтара. Як паведаміла Аляксандра Янішэўская з Асяродка „Карта", які выдаў кнігу, Стэфан Домбскі выйшаў, мабыць, з дваранскага саслоўя, бо ў дзяцінстве тытулавалі яго панічам. Мабыць, такое дзяцінства можна прымеркаваць да бестурботнага райскага жыцця, да моманту выхаду ў юнацтва, калі такі чалавек высоўваецца з-пад бацькоўскага нагляду і атрымлівае магчымасць самастойнага выбару, як у Эдэме Адам, у тым ліку і спакушальнага яблыка з дрэва пазнання дабра і зла. І ў той перыяд на маладога Стэфана Домбскага навальваецца вайна з ейнымі „прапановамі", ад якіх ён не адмаўляецца, бо ж амаль кожны хлапец хоча стаць героем. Пасля вайны аўтар апынаецца на Захадзе, дзе вядзе зусім негеройскае жыццё, канфліктуецца з сямейнікамі, працуе прыхваткамі. І мае час вярнуцца ўспамінамі не толькі ў эпоху ваенных жахаў, але і ў час свайго дзяцінства, калі засвойваў азы не толькі патрыятызму, але і агульных прыстойных паводзін.

У сустрэчы прысутнічаў прафесар Гжэгаж Осташ, даследчык жэшаўскага падполля, які паведаміў, што многія прыведзеныя Домбскім здарэнні пацверджаны дакументальна, хаця не ўсе дакладна апісаны, даты некаторых падзей недакладныя, некаторыя факты выдуманыя. Магчыма, што прычынай гэтых разыходжанняў быў узрост аўтара — свае ўспаміны пісаў ён на старасць. Магчыма таксама, што аўтар хацеў напісаць пра ўсё шчыра, аднак некаторыя свае не надта пахвальныя дзеянні ўсё ж такі прыкрыў маскіруючымі выдумкамі.

Такой, для прыкладу, выдумкай з'яўляецца абгрунтаванне забойства прыгажуні Ядзі Пераржанкі. Аўтар напісаў, што яна ўдала гестапаўцам сям'ю свайго каханка за тое, што яму было нясцешна жаніцца з ёю. І быццам тую ўсю сям'ю гестапаўцы расстралялі. Аднак даследчыкі ўстанавілі, што той сям'і ніхто не расстраляў, ніхто ў ваенны час не непакоіў. Гэтая ўстаўка аўтара здаецца мне быць мэтанакіраванай, каб неяк прыкрыць неабгрунтаваную экзекуцыю, якая магла быць элементам асабістай расплаты закаханага ў ёй, але адкінутага, юнака; нядаўна, пару ж гадоў таму, такі „ўхажор" забіў міс Польшчы...

Варта прывесці заключныя словы самога аўтара, удзельніка апісаных ім жахлівых падзей: „Przez lata po zakończeniu wojny próbowałem analizować siebie samego i w końcu uznałem, że doszedłem do tego zwierzęcego stadium głównie przez moje wychowanie w młodych latach — w atmosferze do przesady patriotycznej. Każdy z nas rodzi się jak ten prosty kamień, który można uciosać według własnego upodobania. Każdy z nas, bez względu na narodowość, jest taki sam. Gdy się dziecku wpaja od kolebki, jak ważna jest Ojczyzna i że trzeba za nią walczyć z nieprzyjacielem aż do śmierci lub zwycięstwa, to to dziecko, gdy dorośnie, będzie walczyć na rozkaz i strzelać do każdego, kto ma inne poglądy lub jest innej narodowości. Pisząc dziś te wspomnienia, próbuję — podając różne przykłady — usprawiedliwić siebie i takich jak ja, gdy chodzi o ogromne krzywdy, jakieśmy w tym czasie wyrządzili rasie ludzkiej. Za późno dziś, by prosić kogokolwiek o przebaczenie, tak się ludziom życia nie przywróci. Niech to będzie jeszcze jedno ostrzeżenie dla przyszłych pokoleń i różnych organizatorów politycznych. Niech pamiętają, że każda wojna to tragedia, że w niej zawsze giną ludzie młodzi, mający całe życie przed sobą — i to giną niepotrzebnie".

Публіка аднеслася да кнігі даволі крытычна, а гэта па той прычыне, што выступоўцы з аўдыторыі выносілі свае ўласныя веды, аспрэчваючы ўсе іншыя і не шкадуючы кнізе заган. У прынцыпе выступоўцы патрабавалі, каб такога роду кніга ўключала, апрача бесстаронніх апісанняў крывавых падзей з польска-нямецкага і польска-ўкраінскага змаганняў, нейкія „правільныя" ваенныя подзвігі альбо хаця такое тлумачэнне, якое вяло б чытача да пажаданых прамоўцамі высноў. Нечаму дзівавацца, прысутныя ў зале не былі знаёмы з такім альтэрнатыўным стаўленнем да ўласнай гісторыі, якое паказаў аўтар.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Падыход пад дурнога хату

Нават прытомныя людзі, ніўскія карэспандэнты, стрэляныя вераб'і, якія звочаць кожную падазроную справу і пакрытыкуюць найменшую саломінку ў воку рэчаіснасці, лямантуюць на старонках любага тыднёвіка: ашукалі, абдурылі, увапхнулі барахло! А была такая нагода, такая рэклама!.. Пасля закабальваюцца ў шматмесячныя даўгі, апрытомнеўшы заўважаюць, што тое, што ім прадалі, з заганамі або зусім ім непатрэбнае. Нават не прадукт раскошы, а звычайная напатрэбшчына, якую можна купіць у краме за ўтрая меншыя грошы, а калі не купіш, дык і без гэтага пражывеш. Людзі зарабляюць марна, дык паласіцца могуць на лёгкі выйгрыш. Прапануюць яго ўнушальныя персоны, часам з харызматычнай усмешкай, якім давяраеш. Скажам, пану Зыгмунту Хайзеру, калісь неблагому журналісту, які „вырабіў твар" на рэкламах сціральных парашкоў, якія выдатна высціраюць кожны каўнерык. І кожную кішэню! Трэба толькі выслаць адну эсэмэску на нумар 8043. Дармовую. І маеш шанц выйграць 10 тысяч злотых. Высылаю. Адразу атрымліваю адказ: „Уласніка тэлефона 661... просім даслаць адну эсэмэску на 74500 (...) Віншуем! Пустая эсэмэска, цана 4,80 зл.". Высылаю. Другая эсэмэска: „Нумару 661... Хочам выплаціць табе на твой рахунак 10 тысяч злотых. Пацвердзь прыняцце прэміі. Вышлі пустую эсэмэску на нумар 74500". Пацвярджаю. Мушу праверыць, ці можна выйграць. Такі эсперымент.

Пятая эсэмэска. „Заблакаваны перавод! Просім уласніка тэлефона 661... выслаць эсэмэску са зместам ТАК на 74500. Будзеш скакаць ад шчасця! ТАБЕ ўдалося!". Сярэдне шчаслівая, высылаю. Пасля сёмай эсэмэскі не высылаю сваёй, бо на рахунку СІМ не хапіла ўжо сродкаў. Ды яны не адпускаюць. Пятнаццатая эсэмэска: „Апошні раз фармальна заклікаем абанента ПЛЮС прыняць вестку ад кіраўніка латарэі. Вышлі адну эсэмэску на 74500. 10 000 зл. гатовыя для высылкі".

І так у падобным тоне і з падобным зместам высылаліся мне чарговыя эсэмэскі. Адказваю да дваццаць пятай. Падмацоўваю чарговы рахунак на мабільніку, аж трачу 150 злотых. Дзевяностая эсэмэска прыходзіць такога зместу: „Распараджэнне аб перадачы 10 тысяч злотых чакае подпісу аддзела ўзнагарод. Мусіш выслаць толькі адну пустую эсэмэску на 74500 для атрымання правамоцтваў". Не, не адпраўляю пустой эсэмэскі, толькі пішу, каб спалучыліся са мною тэлефанічна — ёсць жа ў іх мой нумар, на які шлюць эсэмэскі, пішу яшчэ аб зладзействе і ашуканстве. Праз пару секунд прыходзіць да мяне чарговая эсэмэска, а пасля наступныя, наступныя, аж абрыдла іх адкрываць. Дзесьці каля 115 паявілася сума 20 тысяч злотых. І наступная, і наступная. Намаўляюць мяне ці то сам кіраўнік, ці то нейкая Сільвія ці Анна. Я перастаю адказваць да моманту, калі прысылаюць пытанне пра маё імя, „бо гэта ўжо канец, атрымаю 20 тысч злотых!" Перасталі дабівацца на 134 эсэмэсцы. Трачу каля 200 злотых. Але ці вылечылася я цяпер хоць з цікаўнасці, калі не ахвоты „адкавацца"? Сёння зноў мяне спакусілі. У тэлебачанні, на досвітку. Дзве карцінкі адрозныя адной дэталлю. Апошнія секунды, адзін тэлефон і выйграю 3 тысячы злотых. Званю, мілая пані ветлівым голасам пытаецца: „Ці Польшча мяжуе з Нямеччынай? Калі так, уцісні кнопку з лічбай 1, калі не — 2". А я ж рыхтавалася да пытання, якімі дэталямі адрозніваюцца карцінкі. Націскаю кнопку 1. „Ты памыліўся, спрабуй яшчэ раз. Узнагарода чакае".

Міра ЛУКША

Мастацкая Гайнаўшчына

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У нашых гмінах жыве многа здольных людзей, якія па-аматарску займаюцца мастацкай творчасцю. Сярод вясковых творцаў часцей за ўсё можна спаткаць разьбяроў і вышывальніц. Аднак сустракаюцца таксама таленавітыя жывапісцы. Гэты від творчасці больш характэрны гараджанам, якія ў гайнаўскай рэчаіснасці найчасцей з'яўляюцца выхадцамі з вёсак. Таму менавіта матывы сялянскага жыцця і прыроды часта паяўляюцца ў працах нашых творцаў. Гэтую з'яву можна было заўважыць на адкрытай 28 лістапада ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы выстаўцы XVII Агляду непрафесійнага мастацтва Гайнаўскай зямлі. Мастакам Гайнаўшчыны пашанцавала, бо ўжо здаўна маюць яны магчымасць пастаянна прэзентаваць свае новыя работы і ў паасобных відах мастацтва змагацца за першынство. Але здараецца, што да ўдзелу ў аглядах непрафесійнага мастацтва прыступаюць таксама мастакі з-па-за Гайнаўскага павета, напрыклад, Славамір Рыбак і яго сын Матэвуш, якія жывуць у Нурцы-Станцыі.

— Цешыць нас, што на наш конкурс паступае многа прац, а сярод творцаў паяўляюцца новыя асобы. Важна, што непрафесіяналы, якія штогод прыступаюць да конкурсу, чакаюць яго, выконваюць новыя працы і маюць нагоду, каб ацанілі іх прафесійныя творцы і паказалі на выстаўцы, — сказаў Андрэй Скепка, дырэктар Гайнаўскага дома культуры, арганізатар мастацкага агляду. Адкрыў ён мерапрыемства і разам з новым бурмістрам Ежы Сіракам, прадстаўнікам конкурснай камісіі, гайнаўскім мастаком Яраславам Пэршкам і працаўнікамі ГДК уручаў пераможцам дыпломы, узнагароды і статуэткі, якія сталі ўжо сімваламі гайнаўскага мерапрыемства.

— Нашы творцы не ставяць сабе за галоўную мэту дабіцца прызнання. У сваіх працах выяўляюць яны свае адчуванні. Выконваюць свае работы з патрэбы сэрца, а не дзеля камерцыйнага прыбытку. Ацэньваючы працы, мы ў галоўным звярталі ўвагу на экспрэсію мастацкіх работ, — гаварыў Яраслаў Пэршка.

Першыя месцы ў катэгорыі разьбы атрымалі Мікола Корх з Кархоў (афіцыйная назва — Краськаўшчызна) і Міхал Коц з Гайнаўкі — лаўрэаты ранейшых выпускаў гайнаўскага агляду.

— Я найахвотней займаюся вырабамі з карэння. Трымаюся прынцыпу, каб як найменш працаваць з долатам. Найчасцей выконваю постаці, — сказаў Мікола Корх.

Аднак у доме мастака бачыў я таксама прыгожую разьбу. На Гайнаўшчыне ён вядомы як аўтар помнікаў. Летам яго барэльеф са спаленым і жывым лесам, а таксама з пажарнікам быў урачыста адкрыты ў Чахах-Арлянскіх з нагоды круглай гадавіны пажару лесу побач гэтага сяла.

— Мая разьба — гэта найчасцей постаці, прадстаўнікі розных прафесій, — сказаў Міхал Коц.

Узнагароду ў музеі атрымаў ён за выявы праваслаўнага і каталіцкага святароў.

Другое месца ў катэгорыі разьбы заняў Мячыслаў Дудзін, а трэцяе — Мікола Ягадніцкі. Сярод жывапісцаў перамагла Тамара Кердалевіч з Чаромхі са сваімі алейнымі краявідамі.

— Я малюю тады, калі паяўляецца ў мяне ўнутраная патрэба. Малюю тое, што мне падабаецца. Я адносна мала выканала сваіх работ. Ёсць у мяне свае творчыя планы. На выстаўцы побач алейных прац экспануюцца таксама мае работы выкананыя ў тэхніцы акрыл, а я яшчэ і батыкам займаюся. Побач краявідаў малюю кветкі і нацюрморт, — расказала Тамара Кердалевіч, якая ўжо некалькі разоў была лаўрэатам мастацкага агляду ў Гайнаўцы.

Мікола Корх (злева) і Міхал Коц з узнагароджанымі працамі

Другое месца ў гэтай катэгорыі занялі Матэвуш Рыбак з Нурца-Станцыі і Януш Кулеша з Цісоўкі (узнагароджаны былі іх краявіды). На трэцім месцы апынуліся добравядомыя самародныя жывапісцы Мікола Яноўскі са Старога Беразова (з царскім палацам у Белавежы на алейнай карціне) і Славамір Рыбак з Нурца-Станцыі (з прыгожым краявідам з Падляшша). Апошні мастак хіба першы раз на гайнаўскім конкурсе апынуўся ззаду за сваім сынам Матэвушам. Відаць было, што абодва жывапісцы крыху хвалююцца з-за горшага месца. Мікола Яноўскі папрасіў прадстаўніка конкурснай камісіі растлумачыць якія ён зрабіў памылкі і ў чым павінен паправіцца.

— Я не бачу памылак на вашых працах. Аднак гледзячы на краявід, людзі шукаюць нейкіх уражанняў. Мы ацэньвалі, якія ўражанні выклікаюць вашы работы, — тлумачыў Яраслаў Пэршка, член конкурснай камісіі.

Несумненна самую вялікую радасць ад перамогі аказаў Марк Тамашэўскі, калі статуэтку гайнаўскага агляду ўручыў яму мастак Яраслаў Пэршка

Тамара Кердалевіч на фоне сваіх карцін

— А што перашкаджае, каб падрыхтаваць нас, каб мы лепш малявалі? — пытаў Мікола Яноўскі. — Раней я на конкурс у Ваяводскі асяродак анімацыі культуры ў Беластоку аддаў свае працы і не атрымаў узнагароды за прыгожыя краявіды, толькі за намаляваную мною конаўку. Я тады спытаў прадстаўніка конкурснай камісіі, што такое знайшлі яны ў маёй конаўцы і мне сказалі, што важная не толькі самая конаўка, але асяроддзе, якое яе акружае. А якое ж там было асяроддзе на маёй карціне? Конаўка стаяла на стале і нічога больш там не было, — тлумачыў Мікола Яноўскі.

Мастак Віктар Кабац сказаў, што прапановы ладзіць майстар-класы для мастакоў-аматараў паяўляліся ў Гайнаўцы ўжо і раней.

— Няма грошай для рэалізацыі гэтай задумы. Няма таксама адпаведных умоў для арганізавання такіх заняткаў у ГДК і ў Беларускім музеі, бо трэба было б раней купіць адпаведныя прылады і матэрыялы. Асобы, якія маглі б павесці такія курсы ў Гайнаўцы знайшліся б, — сказаў Віктар Кабац.

З падобнымі праблемамі сутыкаюцца таксама мастакі-аматары на Бельшчыне і ў іншых рэгіёнах Беласточчыны.

— На курсах не трэба было б вучыць нашых самародных мастакоў усяму таму, што набліжала б іх да прафесіяналаў. Хапіла б пазнаёміць іх з асноўнымі справамі, каб яны надалей малявалі па-свойму, але ўжо пазбягалі памылак, — сказаў жывапісец Віктар Кабац.

У катэгорыі рысункаў першае месца заняў Юрый Жукоўскі з Гайнаўкі (узнагароджаны краявід старой Гайнаўкі і рысунак кафлянай печы), а другое месца прызначылі Анне Кузыцы з Новага Беразова (за рысунак царквы ў гэтай вёсцы і старога млына).

У катэгорыі творцаў-інвалідаў, якія штогод дасылаюць свае працы на агляд, першае месца заняў Марк Тамашэўскі (свае цікавыя працы зрабіў пяром). Другое месца прызначылі Яраславу Яблонскаму (за разнаколерныя пастэлі). Марк Сакоўскі (краявіды выкананыя тэхнікай акрыл) таксама заняў другое месца, а на трэцім месцы апынуўся Яўген Віснеўскі (за кветкі намаляваныя з дапамогай акварэльнай крэйды). Усе галоўныя ўзнагароды атрымалі асобы, якія займаюцца ў Павятовым асяродку дапамогі ў Гайнаўцы. На выстаўцы можна таксама пабачыць работы ўдзельнікаў майстар-класаў па заняткавай тэрапіі ў Гайнаўцы і з Дома сацыяльнай дапамогі „Ракітнік" з Белавежы, якія атрымалі вылучэнні. У Беларускім музеі размешчаны таксама працы іншых удзельнікаў агляду, што атрымалі вылучэнні, а нават і тых неўзнагароджаных. Наведвальнікі выстаўкі могуць асабіста ацаніць усё самароднае мастацтва дасланае на агляд.

— На сёлетнім конкурсе зацікавіла мяне разьба, якая ў выкананні нашых мастакоў-аматараў ад пэўнага часу становіцца штораз больш народнай і добра, што эвалюцыянуе ў гэтым напрамку, — заявіў Віктар Кабац.

Яго працы можна ўбачыць на калідоры Беларускага музея перад залай, у якой знаходзяцца конкурсныя работы. Падрыхтаваў іх як дадатковы атракцыён для агляду. Размешчаны там занатоўкі з Белавежскай пушчы, выкананыя тушшу і пасля закончаныя ў майстэрні. Пушчанскія кліматы, як называе сваю выстаўку мастак, прэзентуе ён у музеі з думкай пра вядомую даследчыцу пушчы Сімону Косак.

Нараўчанская гміна

Няма раскладаў

Аўтобусы ПКС з Беластока ў Нараўку і далей у Гайнаўку ездзяць па двух маршрутах: адзін цераз Сушчу і другі цераз Бандары. На аўтобусных прыпынках стаяць дашкі і зараз толькі ў некаторых з іх вісяць актуальныя расклады язды.

6 мая 2010 года транспартнае прадпрыемства ПКС у Беластоку (па вул. Фабрычнай, 1) выслала адказ на мой допіс пад загалоўкам „Калі будзе аўтобус ПКС" („Ніва" № 11):

„Przedsiębiorstwo Komunikacji Samochodowej S. A. w Białymstoku uzupełni tabliczki przystankowe w Plancie, Grodzisku i w Narewce podczas najbliższej akcji uzupełniania informacji rozkładowych. Z poważaniem — Kierownik Pionu ds. Przewozów Paweł Krzysztof Gogiel".

Зараз 2010 год ужо на зыходзе, а раскладаў як не было, так і няма. Калі будзе тая акцыя расклейвання раскладаў, невядома.

Расклады, аднак, неабходныя. Дрэнна, калі іх няма.

Супрасль

24 лістапада г.г. паехаў я ў Супрасль. З Беластока ездзяць туды аўтобусы ПКС і транспартнай фірмы „Voyager". Усё было б добра, калі б у Супраслі на ўсіх аўтобусных прыпынках былі расклады язды аўтобусаў. А іх няма. Як тады даведацца, калі тыя аўтобусы вяртаюцца назад у Беласток? Расклады паздзіралі з дошчачак, замацаваных на слупках, між іншым каля Гарадской управы. Па ўсім відаць, што гарадскія ўлады гэтага не бачаць. Не бачаць гэтага і радныя, і солтысы. Можна спытацца, ці яны ездзяць агульнадаступнымі сродкамі транспарту. Мабыць, ездзяць на ўласных аўтамабілях. Адкуль ім ведаць, што на аўтобусных прыпынках няма раскладаў?! Можа, мой допіс прачытаюць і паклапоцяцца пра тое, каб ПКС і „Voyager" наклеілі расклады?

Смецце паабапал дарогі

Саўляны — вёска распаложаная каля Беластока — усяго 1-1,5 км ад гарадской вуліцы 27 Ліпеня. У Саўляны вядзе асфальтавая дарога. Далей яна бяжыць у Каракулі ды ў Агароднічкі. Нядаўна работнікі дарожнай службы ссеклі кусты паабапал гэтай артэрыі. У равах паказаліся гурбы смецця, усялякай макулатуры і парваных фольгавых мяшкоў. Гэтага „дабра" ніхто не збірае і не вязе адсюль на звалку. А можа дарожныя работнікі не спяшаюцца з добраўпарадкаваннем абочын і чакаюць калі пойдзе снег? Ён прыкрые белым пухам гэтае барахло і яго не будзе відаць. Галоўкі працуюць!

Веласіпедныя дарогі

У кастрычніку гэтага года пачалі пабудову веласіпеднай дарожкі ў Беластоку побач маставой вуліцы 27 Ліпеня. Нават для яе пабудавалі другі масток на рачулцы Далістоўцы. Зараз дарожку пракладваюць на 2-кіламетравым адрэзку — ад папраўчага дома ў канец горада, за якім пачынаецца лес.

Сёлета ў кастрычніку закончылі тут аднаўленне асфальтавай маставой.

Варта дадаць, што ў кацы мінулага года вуліца 27 Ліпеня атрымала новае электраасвятленне.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Уладзімір СІДАРУК

Час на аднаўленне

Сёлетнія самаўрадавыя выбары ў Чаромсе праходзілі без правапарушэнняў. Гміна была падзелена на сем выбарчых акруг, у якіх 3 087 чарамшан (з правам голасу) выбрала 15 радных. Працавалі два выбарчыя ўчасткі: у мясцовым ГАК і ў Пачатковай школе. У выбарах удзельнічала 2 040 чалавек, што склала 66,08% ад агульнай колькасці выбарцаў. Так высокі паказчык яўкі ў Чаромхаўскай гміне сведчыць аб заўзятым змаганні паміж двума супрацьстаўнымі лагерамі: тых, што стаялі на баку Міхала Врублеўскага (старога войта), і тых, што падтрымлівалі настаўніка Ежы Шыкулу. Большасць выказалася за „аднаўленне". Перамог Ежы Шыкула. У Чаромху завітала ўрэшце доўгачаканая „адліга"...

Дэлегацыя Саюза пенсіянераў уручыла букеты кветак Ежы Шыкулу

2 снежня адбылася інаўгурацыйная сесія Рады гміны. Узначаліў яе радны мінулага склікання Раман Туркевіч, які прывітаў войта-электа, солтысаў, запрошаных гасцей, новаабраных радных і шматлікае кола жыхароў пасёлка. Затым быў адобраны парадак сесіі. Асноўнай мэтай было прывядзенне да прысягі новаабраных радных, выбары старшыні і намесніка старшыні Рады гміны ды дзвюх камісій: гаспадарчага развіцця і бюджэту ды рэвізійнай. Старшыня Гміннай выбарчай камісіі Валянціна Верамчук уручыла Ежы Шыкулу пасведчанне аб выбары на войта і такія ж пасведчанні ўручыла радным. Затым прагучаў дзяржаўны гімн і наступіла цырымонія прысягі.

Для правядзення выбараў была створана падліковая камісія ў складзе Ежы Сцяхура — старшыня, Лявон Мусюк і Мікалай Самасюк — члены. На старшыню Рады гміны прапанавалі Вячаслава Барташэвіча, Славаміра Беразовіча і Надзею Суліму. Перад галасаваннем вядучы сесію радны Раман Туркевіч звярнуўся з заклікам да новаабранай Рады, каб станоўча паставілася да супрацоўніцтва з войтам і разам узяліся за працу, бо адно ў дружнай сям'і можна дабіцца поспехаў. «Згода будуе, нязгода разбурае» — завяршыў выступленне радны Туркевіч. У выніку галасавання В. Барташэвіч атрымаў адзін голас а С. Беразовіч і Н. Суліма — па сем галасоў. У час паўторнага галасавання Надзея Суліма (яна старшынствавала Радзе ў мінулым скліканні) перамагла Славаміра Беразовіча адным голасам (8:7), затым пераняла абавязкі вядучай сесіі. Сакратар гміны Марыя Іванюк павіншавала Надзею Суліму з паўторным выбарам на старшыню Рады і ўручыла ёй букет кветак. Намеснікам старшыні Рады гміны быў выбраны Вячаслаў Барташэвіч (Выбарчы камітэт пенсіянераў пагранічнай аховы), які ў тайным галасаванні перамог Валянціну Кердалевіч (Выбарчы камітэт „Чаромха-2010") вынікам 9:6.

Шмат закалоту ўзнікла пры выбары старшыні Камісіі гаспадарчага развіцця і бюджэту. Ад гэтага абавязку адмовіліся А. Каліноўская, М. Самасюк, Я. Ліпінскі, Е. Сцяхура і М. Шатыловіч. Пагадзіўся адно Міраслаў Лук'янюк. Яго кандыдатуру замацавалі ў адкрытым галасаванні 14 радных (ён сам стрымаўся ад голасу). Намеснікамі старшыні гэтай камісіі аднадумна 15 галасамі былі выбраны Мікалай Самасюк і Мікалай Шатыловіч. Старшынёю Рэвізійнай камісіі была паўторна выбрана Альжбета Каліноўская, а яе намеснікамі сталі Раман Туркевіч і Міраслаў Лук'янюк. Пры пункце „справы розныя" сакратар гміны Марыя Іванюк прыпомніла войту-электу і радным аб абавязку абнародавання дэкларацыі аб даходах і маёмасці.

У заканчэнні сесіі жыхары пасёлка, узначальваныя старшынёю Саюза польскіх пенсіянераў і інвалідаў Юзэфам Дубковічам і Зыгмунтам Кастоўскім, уручылі букеты кветак Ежы Шыкулу. Прысутныя прынялі гэта стоячы бурнымі апладысментамі. Ежы Шыкула падзякаваў прысутным ды жыхарам гміны (тым, якія за яго прагаласавалі і тым, што стрымаліся ад голасу) за аказаны давер і запэўніў, што пастараецца зрабіць усё, каб гэты давер апраўдаць. «Час мінулае аддзяліць тоўстай рыскай, — гаварыў войт-элект. — Перад намі шмат задач, якія трэба рашаць і змагацца з праблемамі штодзённага жыцця. Затым бярэмся за работу!».

На гэтым I сесія Рады гміны ў Чаромсе закончылася.

Адгалоска

Чытача трэба шанаваць

Спадар Вярбіцкі ў сваім адказе «Sorry» («Ніва» ад 18.11.2010 г.) замест проста і зразумела аднесціся да майго допісу «Інсінуацыі ў адрас эколагаў», то, як сам піша, «наборам літар» хоча ўсё паблытаць, прыпамінаючы пры нагодзе нават Карла Маркса. Чытач, калі гэты адказ прачытае па нейкім часе, разгубіцца зусім. З тэксту будзе вынікаць, што справа датычыць не брыдкай інсінуацыі ў адрас экалогаў, а таго, што МК (!) (значыць, ніжэйпадпісаны) не дарос, каб чытаць фельетоны публіцыста Аляксандра Вярбіцкага.

Аўтар адказу «Sorry» піша , што ён у фельетоне «Вяртанне новага» («Ніва» ад 17.10.2010 г.) нічога не інсінуе, толькі што была гэта такая асацыяцыя экалагізму з калектывізацыяй канца дваццатых гадоў XX стагоддзя на Беларусі, асацыяцыя экалагізму з Паўлікам Марозавым, асацыяцыя экалагізму з чырвонымі кхмерамі. І што добра было б «як мінімум», каб я «навучыўся адрозніваць асацыяцыю» ад «атаясамлівання, якое ён (значыць, МК) пабачыў у нейкай сваёй відзежы».

Адказ на допіс

Sorry

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Магчыма, што слынны Карл Маркс (КМ) памыляўся, магчыма, што ацэнка для мас — гэта не рэлігія, а ў нашых умовах опіум для мас з'яўляецца вераломна палітыка, а дакладней кажучы — палітыканства; калі глядзець як ў працэсе эвалюцыі пашы масы пераймаць мордае ў стандартавасной англамоўнай прасторы: „Ecology is the scientific study of the relation of living organisms to each other and their surroundings. Ecology includes the study of plant and animal populations, plant and animal communities and ecosystems". Тут чалавека зусім не згадваецца. Мой рацыю КМ — будучы не хамаліся і надалей не ілюміцца чалавечым лёсам. Толькі цяпер яны ў нашых эмпірыстаў кумірамі. Тамр цяпер яне хіба прыйдзецца пакуплівы запаліцца ім і бегаць за іхнімі запаведкамі, мо не падна дабраволна, мо пад нейкім прогнозам нейкага спрымарыльнага інсінітара.

І я адразу вельмі такаеся аб дыяр-

Мне здаецца, што відзеж маю правільны, прынамсі, калі гаворка ідзе пра ахову адзінага такога лесу ў Еўропе. Існуе ён некалькі тысяч гадоў без умяшальніцтва чалавека. І няпраўда, што эколагі націскаюць на адміністрацыю, каб «адчужыць пушчанскае насельніцтва ад Белавежскай пушчы». Справа ў тым, каб спыніць прамысловую эксплуатацыю пушчы, бо чым іншым з'яўляецца лес насаджаны нават «стараннем навакольнага насельніцтва», а чым іншым лес, які сам адраджаецца.

У адказе «Sorry» А. Вярбіцкі папракае мяне, што я іду нібыта за модай «экалагізму», з юнацкім энтузіязмам успрымаю піяраўскія выдумкі. Пра мае адносіны да аховы прыроды Вярбіцкі нічога не ведае, бо і адкуль, але дзеля публіцыстычнай філіпікі, каб паказаць хто тут разумны, а хто наіўны, піша.

Я — звычайны чытач «Нівы», які яшчэ мае ахвоту, можа не з юнацкім энтузіязмам, адгукнуцца на тыя ці іншыя думкі ніўскіх аўтараў. Невядома ці не з'яўляюся адзіным чытачом «Нівы» ў Трыгарадзе, які пастаянна ад некалькіх гадоў чытае «Ніву». Вядома, не толькі «Ніву». Дзесяткамі гадоў з'яўляюся чытачом «Палітыкі» і не здарылася, каб нейкі журналіст гэтага тыднёвіка аднёсся да свайго чытача так як журналіст «Нівы» ў сваім допісе «Sorry». А чытача, незалежна ад усяго, трэба шанаваць, бо дзякуючы чытачу ён існуе. Магу працытаваць напісанае як доказ майго сцвярджэння, але навошта, бо хто чытаў адказ «Sorry», той ведае аб чым пішу.

Пішу аб гэтай справе не таму, што я пакрыўджаны. Мог бы я махнуць рукой на тое, што я недавучаны, каб чытаць тэксты А. Вярбіцкага. Але неяк удаецца мне зразумець іншых аўтараў.

Справа ў тым, што некаторыя журналісты разбэсціліся сітуацыяй, што не трэба дбаць пра чытачоў. То так як бы тыднёвік існаваў не для чытачоў, а для журналістаў. Думаю, што выдавец — Праграмная рада тыднёвіка «Ніва» — задбае пра тое, каб існаваў ён для чытачоў і для беларускай культуры. А так пры нагодзе, дзе знікла «Літаратурная старонка»? Няма літаратуры ці літаратараў?

З павагай
Міхась КУПТЭЛЬ

Жыць для Беларусі!

У бездарожжа для тых, каму шчасціць,
Дагарае ўначы маё сэрца...

Уладзімір Караткевіч

Леакадзія МІЛАШ

У зале ТБК

У апошнюю суботу лістапада ў Таварыстве беларускай культуры ў Літве адбылося чарговае мерапрыемства. Пачаў старшыня таварыства з прыемнага — днямі адзначыў свой дзень народзін сябра Рады Вацлаў Гульбіновіч, войт Вільні. А потым — з сумнай навіны: на мінулым тыдні адышоў у іншы свет шчыры беларус Янка Жучка. Ён быў чальцом СБМ, змагаўся ў беларускім войску, пасля вайны ў яго былі два шляхі: вярнуцца ў Беларусь, альбо ўцякаць з немцамі далей на Захад. Ён выбраў апошняе, жыў у Бельгіі. Калі стала Літва незалежнай, Янка Жучка некалькі разоў прыязджаў у ТБК, першы раз у 1997 годзе на Раду БНР. Гэта была першая сустрэча сяброў-змагароў: Янка Жучка, Барыс Рагуля, Кастусь Шышэя, Мікола Рулінскі і іншыя. Потым адбылося яшчэ некалькі сустрэч. Пра свайго сябра-аднадумца расказаў старшыня Хведар Нюнька.

27 лістапада 1920 года пачалося Слуцкае паўстанне, якое ўвайшло ў гісторыю нашага народа як Слуцкі збройны чын, як яркая старонка барацьбы за незалежнасць Беларусі. Асноўнай ідэяй збройнага чыну была незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. Паўстанне адбылося ў канцы савецка-польскай вайны 1919-1920 гг. Выступ беларусаў на Случчыне супраць падзелу тэрыторыі Беларусі паміж Расеяй і Польшчай і ўтварэння марыянетачнага беларускага савецкага ўрада ўзначальваў Беларускі нацыянальны камітэт у Слуцку, які аднавіў сваю дзейнасць пасля заняцця Слуцка польскімі войскамі. Сілы былі няроўнымі, не хапала зброі, боепрыпасаў, харчавання, паўстанне пацярпела паражэнне. Хоць яшчэ доўгі час паўстанцы збіраліся асобнымі групамі па 10 чалавек і працягвалі барацьбу, але яна насіла партызанскі характар. Сярод слуцкіх паўстанцаў было шмат слаўных людзей. Сярод іх і Макар Краўцоў, аўтар гімна „Мы выйдзем шчыльнымі радамі". У гістарычным лёсе Беларусі пачатку XX стагоддзя Слуцкі збройны чын адыграў значную ролю ў вызваленчай барацьбе беларускага народа. Гэта была барацьба за незалежную Беларусь. У ТБК Літвы штогод адзначаецца Слуцкі збройны чын, ён стаў Днём герояў, прыкладам змагання для моладзі, сімвалам барацьбы. Гэтым разам дзень Слуцкага збройнага чыну супаў з датай правядзення мерапрыемства. Споўнілася 90 гадоў з дня паўстання. Аб гісторыі Слуцкага збройнага чыну расказаў Хведар Нюнька. Ён зачытаў і віншаванне ад прэзідэнта Рады БНР Івонкі Сурвілы.

У лістападзе споўнілася 40 гадоў з дня смерці Адольфа Клімовіча. Крысціна Балаховіч зачытала ліст Мар'яна Пецюкевіча да Зоські Верас пра інжынера А. Клімовіча, які даслала ў таварыства ягоная дачка Марыля Пецюкевіч з Рыма. Гэты ліст быў агучаны ўпершыню.

Мар'ян Пецюкевіч піша: „Пару дзён назад атрымаў ліст ад Людвікі Войцік (Зоські Верас), які прынёс мне вельмі сумную вестку. Яна паведамляе, што 24 лістапада на сямідзесятым годзе жыцця памёр інжынер Адольф Клімовіч. Думаю, што вестка пра смерць Адольфа Клімовіча цяжкая і балючая, вельмі сумная для кожнага беларуса, які яго асабіста знаў, які супрацоўнічаў з ім на роднай беларускай ніве, які знаў яго як чалавека і дзеяча. Я інжынера Клімовіча пазнаў даўно. Калі ён вярнуўся з Чэхаславаччыны на Радзіму, закончыўшы там аграномію, я яшчэ вучыўся ў сярэдняй школе. Ён адразу, па прыездзе з заграніцы, прыступіў да культурна-грамадскай і палітычнай працы за незалежнасць Бацькаўшчыны, якую ўзначальваў выдатны палітык, грамадскі і культурны беларускі дзеяч, вучоны і непахісны патрыёт ксёндз Адам Станкевіч... Інжынер Адольф Клімовіч, як кажа пагаворка, з галавой акунуўся ў кіпучую працу для свайго народу. І хіба не было дня і гадзіны ў ягоным жыцці (у розных акалічнасцях), каб ён не працаваў для дабра свайго беларускага народу, каб не думаў пра яго лёс. Ніколі і нідзе ні чынам, ні думкай не адарваўся ад свайго народу, ці-то ў Картузскай Бярозе, куды вывезлі яго ўлады санацыйнай Польшчы, ці то ў савецкім канцлагеры, ці то да канца свайго жыцця ў Вільні, дзе савецкія ўлады не далі яму ніякай працы па спецыяльнасці ці якой іншай разумовай працы. Чэсна зарабляў скромны кавалак хлеба ў ролі арганістага пры каталіцкім касцёле на Звярынцы. Гэту працу ён дастаў ад літоўскага ксяндза, які разумеў цяжкое палажэнне чэснага чалавека, гарачага патрыёта братняга беларускага народу. Інжынер А. Клімовіч да апошніх дзён свайго жыцця цікавіўся беларускімі справамі і сумленна, як мог, працаваў для свайго народу. Да канца жыцця застаўся верны ідэі, якой служыў — ідэі поўнай незалежнасці беларускага народа. Застаецца пытанне яшчэ не разгаданым: А што станецца з тымі скарбамі нашага народу, якія па-зярняці збіраў інжынер А. Клімовіч?". Вельмі падобны і лёс аўтара гэтага ліста. Іх абодвух помняць і шануюць віленчукі-беларусы.

Выступае Крысціна Балаховіч

27 лістапада адзначалі і 80-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча. Пра ягоную творчасць расказала Леакадзія Мілаш. Мы можам ганарыцца, што з'яўляемся сучаснікамі пісьменніка, ягонымі чытачамі. Памятаю 90-я гады мінулага стагоддзя, у кнігарнях Вільні адкрыліся аддзелы беларускай кнігі. Караткевіч — першы пісьменнік, на збор твораў якога падпісаліся не толькі беларусы Вільні. Валдас Банайціс — першаадкрывальнік — у той час з'яўляўся кніганошам. Ён так ганарыўся, што змог набыць пасмяротны зборнік Ул. Караткевіча „Быў. Ёсць, Буду". Пісьменнік часта бываў у Вільні, хадзіў па вулачках старога горада, быў у лясной хатцы Зоські Верас. Мы ганарымся, што наш народ мае такога пісьменніка.

Выступае Леакадзія Мілаш

Гэтым разам у ТБК адбылася прэзентацыя апошняй кнігі Зянона Пазьняка „Цяжкі час — Працяг". Агляд зрабіла Крысціна Балаховіч. На жаль, аўтар кнігі не змог быць на імпрэзе. Ён быў у Вільні ў сярэдзіне лістапада.

Напрыканцы быў паказаны відэафільм з 2007 г. пра святкаванне Слуцкага збройнага чыну. Тады даклад рабіў Валера Місюк. У наступным годзе споўніцца 3 гады, як ён трагічна загінуў. Аб'яўлены збор сродкаў на помнік В. Місюку. Старшыня Таварыства агучыў, што ў наступным годзе Таварыства запланавала дзве вандроўкі — адну на Беларусь, у Мядзельшчыну, дзе пахаваны В. Місюк, другую — у Калінінград. Кожны год ТБК ладзіць такія пазнавальныя, цікавыя, запамінальныя вандроўкі. Як заўсёды, пасля чарговага мерапрыемства, нехта з прысутных узнавіў свае досведы, нехта даведаўся нешта новае.

Жыве Беларусь !

Артыстычныя сустрэчы: Гродна — Беласток

Мерапрыемства пачалося песняй „Беларусь імя святое" ў выкананні ўсіх удзельнікаў фестывалю

XVII Фестываль беларускай і польскай песні „Артыстычныя сустрэчы: Гродна — Беласток" адбыўся 20 лістапада ў Гродне. Асноўнымі арганізатарамі мерапрыемства выступілі Беларускае грамадска-культурнае таварыства і Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт пры падтрымцы Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку і Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы.

У вялікай зале Гродзенскай абласной філармоніі выступілі звыш 250 выканаўцаў беларускай і польскай песні. З Беласточчыны ў Гродна прыехала каля 150 удзельнікаў, якія прадстаўлялі 11 беларускіх самадзейных калектываў, а Беларусь была прадстаўлена польскімі вакальнымі і танцавальнымі калектывамі з Гродзеншчыны.

Мерапрыемства пачалося песняй „Беларусь імя святое" ў выкананні ўсіх удзельнікаў фестывалю. Пасля вядучыя Ева Ласкевіч з Беластока і Аляксандр Паўлючэня са Свіслачы сталі запрашаць на сцэну паасобныя калектывы. Чароўныя песні і палымяныя танцы захапілі публіку, якая ўзнагароджвала выканаўцаў бурнымі апладысментамі. А на заканчэнне фестывалю ўсе выканаўцы разам з публікай праспявалі дзве песні: „Piękna nasza Polska cała" і „Люблю наш край".

Такія мерапрыемствы не толькі падводзяць вынікі работы самадзейных калектываў па абодвух баках мяжы, але і прапагандуюць польскую і беларускую культуру, вяртаюць старэйшае пакаленне, дзяцей і моладзь да нацыянальных вытокаў. А гэта самае галоўнае. Важнае таксама, каб агонь гэтай ідэі не патух.

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

АБ'ЯВЫ

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт Універсітэта ў Беластоку
запрашае на
Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый
праф. **Уладзімір Снапкоўскі**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
„Аб асновах замежнай палітыкі Рэспублікі Беларусь".
9 снежня, пачатак у 17.00,
вул. Лінярскага 3, зала 1Б

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Навошта нам беларуская мова?

На ўроку ў Новым Корніне

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Мала дзе ўжо сустракаем школы, дзе разам працуюць спалучаныя з сабой класы . Такія школкі існуюць у вёсках, на акраінах мястэчак. За іх існаванне заўзята змагаюцца бацькі і мясцовыя актывісты. Дарослыя ведаюць, што ў сваёй мясціне ўсе пра ўсіх усё ведаюць і данясуць ім, калі ў іх дачушкі ці сынка праблемы з матэматыкай ці геаграфіяй...

Падкажуць таксама як хто ставіцца да роднай мовы. Каму „па дарозе" запісацца на ўрокі беларускай мовы, а ў каго ніколі для гэтага *няма часу*. Ды праблема ў іншым.

Тыя, што не ходзяць на ўрокі, распаўсюджваюць дрэнны прыклад:

— А навошта нам тая беларуская мова? — скажуць такія пры цэлым класе.

Аб праблеме „патрэбнасці" беларускай мовы мы гутарылі з вучнямі чацвёртага і пятага класаў у Новым Корніне. Частка нашых сяброў, якая не ходзіць на ўрокі, замоўкла ды саромелася выказаць сваё слова. Праўда, пасля, калі паслухалі сваіх сяброў, якія даказвалі файнасць і патрэбнасць урокаў, яны таксама хацелі ўжо хадзіць. Цікава, ці стрымалі слова?

Каб даказаць патрэбнасць вывучання роднай мовы, не трэба думаць пра ўзнагароды і прызы. Веданне роднай мовы патрэбнае для нас саміх! Ці не прыемна сесці ў цяпле і прачытаць „Зорку"? Або набраць нумар Радыё Рацыя і заказаць па-беларуску пажаданні для сваіх сяброў або сям'і. Каб пачулі нас, што нешта ведаем і разумеем. Якраз, на сустрэчы ў Новым Корніне, мы ўспаміналі дзяўчыну з гэтай мясцовасці, якая жыве ў Ратэрдаме ды часта ў суботу шле пажаданні бацькам і знаёмым, якія таксама слухаюць Падляшскі канцэрт пажаданняў. Вядома, яна карыстаецца беларускай літаратурнай мовай.

ЗОРКА

Міра ЛУКША

Жывінкі з глыбінкі (2)

Чорт Тасманскі з Чартаева

Штосьці крыкнула ў кустах!
Мільгануў ружовы рот.
Рад зубішчаў у пашчы — жах!
Гэта вам не пёсік, кот!
Верашчыць той дзікі звер!
Есці хоча? Ці злуе?
Увесь Чартаеў аж замер
і не дрыгне, не дыхне!
Нарычаўся і... запах.
Пасля шамкаў і хлябтаў
звер згалоджаны ў кустах,
а пасля зноў застагнаў!
А ну, бура на яго!
Што за ліха чорт прынёс
у Чартаеў, як на зло?
Мо такі чартоўскі лёс?
У Аўстраліі ёсць штат,
востраў, дзе яны жывуць.
Чорт Тасманскі акурат
аж да нас схацеў рвануць?!
Мо тут лепшы клімат меў,
і калі нямоглым стаў,
падлячыцца захацеў.
Як дабраўся? Ці ж не ўплаў?
Можа, сеў на самалёт?
У апошні цяжкі час
у Тасманіі ўвесь род
раптам ледзь не ўвесь пагас.
Дык Тасманскі з жонкай чорт,
перабраўшы прапаноў,
сюды з'ехаў на курорт.
Будзе чорт здаровым зноў!
І Чартаеў захадзіў:
як яму, вось, дагадзіць?
Ці ён добра еў і піў?
Што прынесці, што зрабіць?
Жэркі звер... Ды б хай і быў,
ды ці мусіць так крычаць?
Каб не роў так і не выў!...
„Заткні вушы! Будзеш спаць!"
І Чартаеў ходзіць увесь
у навушніках ад рання.
А Тасманскі чорт Алесь
з жонкай Зінай — грамадзяне!

Галерэя зоркі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

1. **Імя і прозвішча:** Аляксандр Адзіевіч (ПШ у Орлі, шосты клас).
2. **Твой любімы прадмет:** інфарматыка.
3. **У жыцці хачу стаць:** інфарматыкам.
4. **У сяброў цаню:** зразуменне, дапамогу.
5. **Не люблю:** зайздрасці.
6. **Па-беларуску размаўляю:** часам з бабуляй і дзедам.
7. **Кніжка, якая мяне захапіла:** «Разведчыкі» (фантастыка часоў Сярэдневякоўя).
8. **Падабаецца мне музыка:** рок.
9. **Твае ўлюбёныя стравы:** варэнікі з малінамі (у школьнай сталовай), спагеці, піца.
10. **Ці ёсць у цябе любімы спосаб адпачынку?** Так, я люблю спаць.
11. **Калі дарасту, хачу жыць:** у Варшаве. Чаму? Бо там ёсць стары горад і там жыве мой дваюрадны брат, якога я вельмі люблю і часта наведваю.

Праклён пустэльніка

(індуская легенда)

Аднойчы, калі кароль Парыкшыт паляваў на антылоп, згубіў дарогу. Ён блукаўся па лесе аж трапіў ў пустэльню старца.

— Падкажы, калі ласка, як выйсці з лесу? — спытаў ён у старога.

— Сам шукай, аж знойдзеш, — адказаў яму стары. — Для такіх, хто забівае нявінную звярыну, я не бачу ніякіх дарог!

Кароль насупіў бровы, знерваваўся і штосьці шапнуў сваім слугам. Яны вокамгненна падалі манарху смярдзючы клунак. Сам Парыкшыт дабыў з мяшка дохлага вужа і кінуў гадзюку старому на шыю.

— Як смееш, стары лахман! — пагразіў яму на развітанне кароль. — Хто цябе навучыў гаварыць такім тонам?!

Стары пустэльнік таксама не астаўся ў даўгу і кінуў праклён у твар уладару:

— Роўна за сем дзён ты памрэш, вяльможны дурыла. Цябе ўджаліць вуж. Гэтыя стварэнні не даруюць такой абразы!

— Ну-ну! Глядзі, каб цябе ніхто тут не ўджаліў у азадак, — пагразіў яму кароль і папёрся са сваёй дружынай шукаць дарогі...

Калі кароль апынуўся ў бяспечным месцы, ён адчуў вялікі страх у сэрцы. І каб не дапусціць да здзяйснення чорных слоў пустэльніка, ён схаваўся ў палацы на недаступнай выспе пасярод возера. Ніхто не меў доступу да Парыкшыта. Але цар-вуж перахітрыў яго. Ён дастаўся ў палац пад выглядам чарвяка ў яблыку. Рабак вылез з яблыка, прыбраў напалову чалавечы і напалову вужыны выгляд і смяртэльна ўджаліў напыхлівага караля. Парыкшыт сканаў на месцы.

Пасля няўдачнага здарэння нашчадкі Парыкшыта рабілі ўсё, каб палагодзіць гнеў цара *нагаў*. У Індыі па наш дзень адпраўляюць нагам (вужам) абрады з песнямі і танцамі, прыносяць ім міскі з малаком у каплічкі, аздобленыя фігурамі вужоў або гібрыдаў людзей-вужакоў. У індускай міфалогіі вужы ахоўваюць пладавітасць і сцерагуць падзямельных скарбаў. Магчыма таму Індыя — самая людная краіна свету, у якой пражывае да паўтара мільярда людзей. А што супольнага з гэтай легендай маюць нашы беларусы? Вось,мілыя,нашы продкі таксама верылі, што вужы ахоўваюць падзямельныя скарбы. У наваколлі Белавежскай пушчы яшчэ адносна нядаўна для іх выстаўлялі місачкі з малаком,часта трымалі вужоў у хаце,каб яны лавілі мышэй.

ЗОРКА

Сярожкі

Вершы Міры ЛУКШЫ

Двух у нас у садку Сярожкаў!
Як анёлкі! Але ж рожкі
час ад часу ў іх убачым.
А каб збіць іх — колькі плачу!
— Мужны я хлапчук — Сярога!
І ці з рогам, ці без рога!
— А малодчык я — Сяржук!
Ты свой рог павесь на крук!
Рожкі гэта не вяночкі
з квецця, з лаўравых лісточкаў!
Рог — складанчык, так для жарту!
У садку ўсе жарту варты.
І танцуем, і спяваем,
разам вершыкі складаем.
Пані, дзеўчынкі і хлопцы.
І бацькі ў нас малодцы!

Музыка з кайфам

Верны слову

Не з польскага Mielnika, ані з чэшскага Melnika, толькі з беларускай Гомельшчыны, з вёскі Доўск родам Андрэй Мельнікаў. Месца, у якім нарадзіўся, можна сказаць, вырашыла накірунак яго творчых пошукаў. А шукае ён перш за ўсё ў скарбах мінуўшчыны. Не ўсе гэтыя скарбы блішчаць і прыдаюць славы беларускаму народу. Але Андрэй Мельнікаў, паказваючы цяжкія і складаныя шляхі беларусаў, усё ж такі нясе шмат аптымізму. Так і было ў час канцэрта барда ў Беластоку. Хаця мушу прызнацца, што былі моманты, калі мне пакацілася слёзка.

Хтосьці падумае: „Бард, які спявае на гістарычныя тэмы! Пры чым тут слёзы? Гэта ж вельмі нудна". Не буду аспрэчваць, што ў нашым жыцці бываюць перыяды, калі больш ці менш падабаецца нам тое ці другое, але калі мастак сваёй дзейнасці аддае сэрца, калі бард спявае цэлым сабою, калі ад слёз можа нас хутка давесці да смеху — гэта ўражвае!

27 лістапада Андрэй Мельнікаў выступіў з нагоды 90-х угодкаў Слуцкага збройнага чыну. Гэта быў вайсковы ўздым беларусаў Случчынны ў 1920 годзе, якія змагаліся за свабоду Беларусі. Трэба прытым адзначыць, што дапамогу неслі ім таксама беларусы Падляшша. Варта помніць пра гэтую падзею, бо многія лічаць яе, побач 25 Сакавіка, адным з найважнейшых беларускіх святаў. Пры такой нагодзе Андрэй Мельнікаў быў зусім невыпадковым, а нават пажаданым госцем. Сваю аўтарскую праграму ўпрыгожыў літаратурнымі творамі, якія чытаў між песнямі. Не бракавала таксама анекдотаў, якія часам адсланялі таямніцы бардаўскага жыцця, часам прыгадвалі здарэнні нашай не так адлеглай гісторыі.

Дзень вайсковай славы, які адзначылі беларусы Беласточчыны, можна назваць сапраўдным святам і важнай творчай падзеяй. Андрэй Мельнікаў чарговы раз паказаў, што гісторыя не мусіць быць нудная, а патрыятызм гэта не толькі абавязак, але і прыгожы стан. Прагулка праз стагоддзі з Андрэем Мельнікавым дае кайф, які стараемся даваць вам таксама кожны тыдзень у „Музыцы з кайфам".

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 50

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 46:

Гук, мох, семя, павучок, вуж, Барак, рай. Голуб, сава, невук, муж, мяч, хакей.

Узнагароды, кніжку Юркі Геніюша „З маёй званіцы" і палатняны кулёк з лагатыпам Радыё Рацыя, выйгралі **Кшыштаф Мікевіч, Паўліна Сноп** з Бельска-Падляшскага, **Эмілія Сцепанюк** з Гайнаўкі. Віншуем!



Тэкст і фота Інфармацыйнага цэнтра ЗБС „Бацькаўшчына”

Юбілей „Бацькаўшчыны”

Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына” адзначыла 20-гадовы юбілей у Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур. На святочную вечарыну 26 лістапада сабраліся сябры Згуртавання, пісьменнікі, грамадскія дзеячы Беларусі, прадстаўнікі амбасадаў і міністэрстваў, беларусы з Украіны, Польшчы, Расіі, Эстоніі, Літвы. Распачала імпрэзу кіраўнік Згуртавання „Бацькаўшчына” Алена Макоўская. У сваёй прамове яна адзначыла асноўныя дасягненні „Бацькаўшчыны” і выказала падзяку тым, хто ў розныя гады стаяў на чале Згуртавання — Васілю Быкаву, першаму прэзідэнту „Бацькаўшчыны”, Яўгену Лецку, Радзіму Гарэцкаму, Анатолю Грыцкевічу, Валерыю Герасімаву, Аляксею Марачкіну, а таксама ўсім, хто на працягу 20-ці год падтрымліваў Згуртаванне, хто працуе на яго карысць зараз. Асобную падзяку Алена Макоўская выказала старшыні Рады „Бацькаўшчыны”, свайму сябру і паплечніку Ніне Шыдлоўскай, без руплівай працы і падтрымкі якой сёння проста немагчыма ўявіць сабе „Бацькаўшчыну”. Таксама Алена Макоўская выказала падзяку Міністэрству культуры Беларусі і асабіста міністру Паўлу Латушку за прадастаўленне памяшкання для правядзення вечарыны. Павел Латушка і ўзняўся на сцэну следам за Аленай Макоўскай. Міністр высока ацаніў дзейнасць Згуртавання адзначыўшы, што фактычна „Бацькаўшчына” працягвае справу Караткевіча — вучыць беларусаў шанаваць сваю зямлю і мову. „Гэта свята ваша, але гэта і наша свята, бо нельга дзяліць беларусаў у Беларусі і ў замежжы, —адзначыў Павел Латушка. — Пад адным і тым жа небам мы нарадзіліся, па адной і той жа зямлі хадзілі, мы гаворым на адной мове, можа, гэта не заўжды беларуская мова, але мы разумеем адзін аднаго. Нас сапраўды аб’ядноўвае Бацькаўшчына”. Падчас выступлення Павел Латушка паабяцаў, што ў далейшым падтрымка беларусаў замежжа будзе ўзмацняцца. Ён адзначыў, што ў наступным годзе будзе прынята праграма „Беларусы ў свеце”, плануецца правядзенне фестывалю беларусаў замежжа, будзе заснаваны Інстытут культуры Беларусі, у структуры якога прадугледжана стварэнне аддзела па пытаннях беларусаў замежжа. Таксама міністр выказаў спадзяванне, што ў біжэйшым часе будзе прыняты Закон аб беларусах замежжа. Павел Латушка перадаў у падарунак „Бацькаўшчыне” перавыданне „Дзікага палявання караля Стаха” Уладзіміра Караткевіча на чатырох мовах і дыск з дакументальным фільмам „Свет Караткевіча”. Вечарыну працягнуў прэзідэнт Згуртавання „Бацькаўшчына” ў 1993-2001 гг. акадэмік Радзім Гарэцкі. Ён выказаў занепакоенасць станам беларускай мовы ў Беларусі, нагадаўшы, што за 10 год колькасць людзей, якія карыстаюцца штодзённа беларускай мовай, зменшылася з 37 да 23%. Ідзе перадвыбарчы перыяд, і цяпер трэба асаблівa ўзмоцнена працаваць, бо ад гэтага залежыць, ці будзе Беларусь беларускай, адзначыў Радзім Гарэцкі. „Нам патрэбен беларускамоўны прэзідэнт, беларускамоўны ўрад, беларускамоўны парламент”, — заявіў Радзім Гарэцкі. Тэму беларускай мовы працягнуў і Генадзь Бураўкін, назваўшы мову „адзіным паролем”, які нас аб’ядноўвае, дзе б мы ні былі. Да гэтай тэмы звярталіся і Алег Трусаў, нязменны старшыня Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, і Яўген Вапа, галоўны рэдактар „Радыё Рацыя” і тыднёвіка беларусаў Польшчы „Ніва”, старшыня Беларускага саюза ў Польшчы. Ён сказаў, што чакае, калі ў суседняй з Беласточчынай Гародні з’явіцца хоць адзін беларускі клас, хоць адна беларуская школа. Старшыня Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі „Беларусы Расіі” Валеры Казакоў сказаў, што часта ў Расіі сутыкаецца з пытаннем, навошта яму беларуская мова. На гэта ён адказвае: „Мова мне павінна грэць душу. Калі я прыйду да Бога, каб я мог сказаць, хто я, адкуль я прыйшоў”. Валеры Казакоў уручыў кіраўніцтву „Бацькаўшчыны” ганаровую грамату ад ФНКА „Беларусы Расіі” ў знак таго, што „мы разам робім адну беларускую справу” і падарыў копію партрэта Сцяпана Батуры, якая захоўвалася ў Калужскім музеі ў Расіі. Валеры Казакоў паведаміў, што там захоўваецца каля 60 вывезеных з Беларусі карцін, і ФНКА „Беларусы Расіі” будзе весці працу па іх вяртанні на Бацькаўшчыну. Дырэктар Віленскага Цэнтра беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры Лілія Плыгаўка адзначыла, што падчас усіх з’ездаў, арганізаваных „Бацькаўшчынай”, пануе атмасфера еднасці, як быццам людзі толькі ўчора развіталіся і сёння зноў сустрэліся. „На сённяшняй вечарыне таксама гэтае пачуццё ёсць, і значыць, нашая праца правільная”, — сказала Лілія Плыгаўка. Віншаванне ад Беларуска-эстонскага згуртавання зачытала Зінаіда Клыга. Яна адзначыла, што за 20 год „Бацькаўшчына” з’ела шмат солі. Каб было з чаго яе запіваць, Зінаіда Клыга перадала ў падарунак кубак з выявай эстонскага трыколера. Напрыканцы Зінаіда Клыга заспявала надзвычай прыгожую і кранальную песню пра Еўфрасінню Полацкую, напісаную на словы беларускага паэта з Латвіі Станіслава Валодзькі. Літаратуразнаўца Лідзія Савік распавяла пра першыя гады дзейнасці „Бацькаўшчыны”, пра тое, як збіраліся кантакты, згадала беларускіх пісьменнікаў замежжа і выказала падзяку сучаснаму кіраўніцтву „Бацькаўшчыны”: „Вялікіх вам поспехаў і вялікі дзякуй, дарагія дзяўчаты!”. У агуле вечар быў багаты на падзякі. Яны гучалі амаль ад кожнага з выступоўцаў. Таксама ў гэты вечар са сцэны павіншавалі „Бацькаўшчыну” старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч; намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў, рэдактар часопіса „Дзеяслоў” Барыс Пятровіч. Івонка Сурвілла даслала для вечарыны аўдыёзварот, старшыня Таварыства беларускай культуры ў Літве Хведар Нюнька перадаў віншаванне ў выглядзе відэазвароту. Вядучыя імпрэзы — Леанід Дранько-Майсюк і Марына Яўсейчык — зачыталі віншаванні ад Ганны Сурмач (ЗША), Валерыя Барташа, Іны Снарскай (Украіна), Міхаіла Буланава (Казахстан), Людмілы Урванцавай (Расія), Вячкі Целеша (Латвія). Гэта толькі невялікая частка віншаванняў, што прыйшлі на адрас „Бацькаўшчыны”, зачытаць іх усе падчас вечарыны проста не было магчымасці. Стварылі святочны настрой ды віншавалі „Бацькаўшчыну” і музыкі: гурт „Стары Ольса”, Алесь Камоцкі, Зміцер Сідаровіч з юнымі артыстамі Тамашом і Адасем, цымбалістка Зінаіда Савяцяева, Лявон Вольскі ды музыкі з „Крамбамбулі”, гурт „Унія”. Пасля імпрэзы падчас нефармальнай часткі адбываліся гутаркі з гасцямі імпрэзы, Ніна Шыдлоўская і Алена Макоўская абмяркоўвалі з прадстаўнікамі беларускіх суполак планы на далейшую супрацу.

Злева направа: Радзім Гарэцкі, Лідзія Савік, Алена Макоўская, Ніна Шыдлоўская

„Стары Ольса”

Валеры Казакоў (злева) — „Беларусы Расіі”

Лілія Плыгаўка з Літвы

Зінаіда Клыга з Эстоніі

Міністр культуры РБ Павел Латушка

Любіла сваю працу

Успаміны Лідзіі Мураўскай з Орлі, у дзявоцтве Нестаровіч, народжанай у 1936 годзе.

У арлянскай пачатковай школе

Дакладна помню хвіліну, калі малой дзяўчынкай пайшла я ў школу. Маёй выхавальніцай з першага да чацвёртага класа была Галена Цежухова. Мяне асабліва ўражвала тое, што яна ўвесь час была з намі — сваімі вучнямі. Ніколі нас не пакідала, нават на перапынках хадзіла з намі, забаўляла. Навучала песень, якія мы ахвотна спявалі, напрыклад, „Poszedł dudek z sową w taniec". Спявалі мы і танцавалі... А мяне да танца заўсёды запрашаў Аляксандр Мураўскі, мой пазнейшы муж — была гэта любоў з маленства. Ды не толькі ён — Ян Война, наш сусед, усе свае малюнкі прысвячаў мне. І Ігар Цімафеюк са Шчытоў-Навадвораў, пазнейшы зэтэмповец, здольны прамоўца...

Пазней, у старэйшых класах мелі мы ўжо розных настаўнікаў. У іх ліку быў Мікалай Нестаровіч, бацька вядомага кінааператара. І Васіль Лашкевіч, выдатны чалавек, які заўсёды прыгадваў нам байку Івана Крылова п.з. „Дзве бочкі". У ёй каціліся дзве бочкі — адна пустая, другая поўная — выдаючы характарыстычныя гукі; байка адносілася да пустой гаворкі. Помню, як выклікаў ён нас да адказаў і часам гаварыў: „Ну, пустая бочка, сядай!". У школе была таксама рэлігія, але ў той час нашага бацюшку Уладзіміра Цэхана трактавалі вельмі кепска, пагарджалі і насміхаліся з яго.

Маімі аднакласнікамі былі м.інш. Галіна Пішчатоўская, Ірына і Тамара Хмялеўскія, двух Аляксандраў Мураўскіх, Таня Багацэвіч... У Орлі я нават сямі класаў не закончыла. Пасля шостага класа, зважаючы на мае спрытныя рукі і ігнаруючы маю мару стаць дантысткай, мама вырашыла, што я павінна стаць краўчыхай. Паслала мяне ў Бельск вучыцца шыць. Пасля года такой навукі я рашыла паступіць у педагагічную школу — тады былі вельмі патрэбныя настаўнікі і да экзаменаў усіх прымалі ахвотна. Дырэктарам гэтай школы быў Мікалай Канашынскі, мажны мужчына, а Скок навучаў беларускай мове; гісторыі навучалі Карачуны. Выдатнымі педагогамі былі паланістка Вольга Такажэвіч і настаўніца матэматыкі Марчукова, якая сумела навучыць нават найбольшых тупіц. Паланістка гаварыла на чыстай польскай мове, вучыла добра і ўсе яе шанавалі. Ды і вучні ў той час інакш адносіліся да настаўнікаў, ды і настаўнікі былі іншыя. Для прыкладу, Цежухова з падставоўкі выхоўвала нас усебакова — вучыла нас есці, спаць, размаўляць, глядзець на чалавека. А сёння вазьмі і знайдзі такога настаўніка, які б столькі часу прысвячаў вучням. Такой выхавальніцы, якой была Цежухова, я больш ніколі не сустрэла. Лічу яе сваім узорам для наследавання і, хто ведае, ці не таму лічылі мяне добрым педагогам.

Станаўленне настаўніцай

У педліцэі трэба было ездзіць на практыкі ў школы і здаваць залікі ўсіх прадметаў. Трапляла пераважна ў вёскі і малыя мястэчкі, дзе настаўнікі былі асабліва патрэбныя. У час практыкі ў Дубінах закахаўся ў мяне малады настаўнік матэматыкі і дапамагаў мне рыхтавацца да ўрокаў. Прыязджаў да мяне нават у Кракаў, калі стала там штудзіраваць.

Пасля завяршэння ліцэя пачала я працаваць у гайнаўскай школе Таварыства прыяцеляў дзяцей; пасля вайны было шмат такіх школ. Гайнаўская школа была прыгожая, побач цяперашняга белліцэя, насупраць тартака. Вучылі там пераважна маладыя настаўнікі, але былі і старэйшыя; жонкай дырэктара школы была Зіна Федаровіч з Орлі. Мне даручылі весці заняткі па фізкультуры ў дзяўчат. Я была натрэніравана дзякуючы сваёй актыўнасці ў школьным узросце: зімою ездзіла ў Орлі на лыжах, прымала ўдзел у лёгкаатлетычных спаборніцтвах, спартыўных зборах. У гайнаўскай школе я навучала таксама рускай мове (беларускай там не было). Я вельмі любіла сваю працу, якая давала мне вялікае задавальненне. Я заўсёды старалася дапамагаць слабейшым вучням, рыхтаваць іх, заахвочваць да навукі...

Не дазвалялі штудзіраваць

Перапрацаваўшы нейкі час у Гайнаўцы я даведалася пра набор на рускую філалогію ў Кракаве. У той час трэба было адрабіць тры гады г.зв. працоўнага загаду, а я гэтай нормы яшчэ не выканала, працавала толькі два гады. Ад гэтага патрабавання былі вызвалены толькі актывісты, „камсамольская моладзь", якім пуцёўкі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы давалі школы, у якіх яны працавалі. Пайшла я са сваёй справай да дырэктара школы, але той развёў рукі і сказаў, што нічога не можа зрабіць. Тое самае сказалі і ў кураторыі — тры гады працоўнага загаду і ні дня менш! Я, аднак, сама вырашыла паехаць у Кракаў на экзамен. І паехала, а праз нейкі час атрымала павестку, што прынялі мяне. Пабегла я з гэтай навінай у сваю школу, а там і слухаць не хацелі пра мой адыход з працы. Дырэктар школы развёў рукі: „Што ж, я вас сілай затрымаць не магу". Але калі я ўжо была ў Кракаве, з кураторыі прыйшло паведамленне, што за самавольную адмову ад працы мне не будуць прылічаны да працоўнага стажу гады маёй работы ў Гайнаўцы. Такое мела быць пакаранне мяне, але я ўжо махнула на гэта рукою; але тыя два гады, аднак, прылічылі. У час штудыяў выйшла я замуж за Аляксандра Мураўскага, майго сябра з падставоўкі.

Пасля штудыяў

Стала я працаваць настаўніцай рускай мовы ў пачатковай школе ў Лодзі; мой муж тады штудзіраваў у тамашняй Вайсковай медыцынскай акадэміі. Ці жыхара цэнтральнай Польшчы можна навучыць рускай мове? У Лодзі, дзе я пачынала працу пасля завяршэння штудыяў, дзеці з чацвёртага класа гарнуліся да навукі, а мне самой прыносілі нейкія сувеніры. У той час руская мова не лічылася нейкім горшым ад іншых прадметам і я заўсёды мела добры кантакт з вучнямі.

Найлепшыя гады маёй працы

Пасля мы перасяліліся ў Холм. Муж стаў на працу ў вайсковай базе і дадаткова ў заразным шпіталі. Жылі мы на тэрыторыі вайсковай часці, у пакінутым саветамі пасёлку. Гэта былі найлепшыя гады маёй працы, бо ж была я яшчэ маладая. Па суботах ладзіліся танцавальныя вечарыны ў казіно, дзе сервіравалі вельмі смачную ежу. Я стала на працу ў эканамічным ліцэі і настаўніцкай штудыі адначасна. Разышлася вестка, што я з'яўляюся выдатнай русісткай... Дырэктар сельскай школы ў недалёкім Акшэве (цяпер гэта квартал Холма) двойчы ў тыдзень прысылаў па мяне шафёра і я таксама вучыла ў тамашняй школе. У той час настаўнікі працавалі таксама па суботах.

Давялося, аднак, памяняць працу, бо ў вайсковых сем'ях службовыя перасяленні на парадку дня. Сумна было расставацца са школамі, з вучнямі. Дырэктар холмскай школы наракаў мне, чаму пакідаю ягоных вучняў, якія патрабуюць майго сэрца, а не толькі гаварыльнай машыны.

Мужа перавялі на службу ў Люблін, дзе пачала я навучаць у прафтэхвучылішчы, пасля тры гады ў ліцэі ды далей стала выкладчыцай рускай мовы ва Універсітэце Марыі Складоўскай-Кюры; працавала там у 1977-1996 гадах. Асабліва многа заняткаў вяла на юрыдычным факультэце і напісала канспект па рускай мове для студэнтаў права, які ахопліваў крымінульную, адміністрацыйную і цывільную праблематыку. Калі мне споўнілася шэсцьдзесят гадоў, адышла на пенсію. А калі б даўней не пераадолела стаўленых перада мною бар'ер, дык асталася б настаўніцай фізкультуры ў Гайнаўцы.

Магла стаць генераліхай

Муж Аляксандр хутка атрымаў званне палкоўніка. Напэўна атрымаў бы і далейшае павышэнне, але ён сам не хацеў нікуды з Любліна адыходзіць. Ён быў вельмі сумленны, нават празмерна. Сабе ніколі нічога не аформіў (нават свайму сыну не памог уладзіцца на працу), толькі іншым дапамагаў. Памёр ён дзевяць гадоў таму, не дажыўшы нават шасцідзесяці пяці. Не хварэў, але меў анеўрызму на брушнай артэрыі ды запозна рашыўся на аперацыю, якой не вытрываў. Спачыў ён на праваслаўных могілках у Любліне.

У царкву не хадзілі

Царква ў Любліне была па Ліпавай вуліцы і толькі там пачалі яе наведваць. А раней, у Холме, не надта. Калі з Орлі прыязджала мама, то хадзілі мы абедзве, бо мама хацела пабачыць. Апрача гэтага ў Холме не было як хадзіць, бо муж быў вайскоўцам на пасадзе, асобай заўважнай, ды і на стукачоў трэба было зважаць.

Наша дачка Кася вывучыла англійскую мову і працуе ў Любліне ў Комплексе аўтамабільных школ. Сын Алік вывучыў ветэрынарную прафесію, аднак з-за неспрыяльнай кан'юнктуры займаецца іншай дзейнасцю — ён камерсант у Гіжыцку; гэта яму адпавядае, бо і водныя спорты любіць.

У Любліне трымае мяне запрацаваная дачка, якой хачу дапамагаць. Маю таксама зямельны ўчастак побач майго пасёлка. А Орля зараз з'яўляецца адзінай мясцовасцю, да якой лячу як на крылах.

Запісаў Міхал МІНЦЭВІЧ

Рэдакцыя тыднёвіка „Ніва"
—
Кафедра беларускай культуры Філалагічнага аддзялення Універсітэта ў Беластоку
—
Кафедра адукацыі і культуры Аддзялення гуманітарных навук Галоўнай школы сельскай гаспадаркі ў Варшаве
—
Ваяводскі асяродак анімацыі культуры ў Беластоку
—
Падляшская бібліятэка ім. Лукаша Гурніцкага ў Беластоку
—
Фонд „Царкоўная музыка" ў Гайнаўцы
—
II Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ім. Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім
—
Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы

запрашаюць

на Юбілей Васьмідзесяцігоддзя з Дня Нараджэння

Алеся Барскага

(Аляксандра Баршчэўскага)

Урачыстасць адбудзецца 11 снежня 2010 г. (субота), а гадз. 16.00 у Ваяводскім асяродку анімацыі культуры ў Беластоку, СПОДКІ, вул. св. Роха, 14

Іслачанскія задуменні

* * *

Блакітны лес
І неба зелень,
Алень чырвоны сонца
Скача ў верхавінах.
Тут многа ўсяго,
А мне хапіла б малавеле
У цёплым закутку краіны.
І я іду спакойна ў даль
Па-гаспадарску,
Пад кожны кусцік зазіраю,
І пахне ціхі вецер
Па-бандарску
У іслачанскім краі.

* * *

Сярод лясоў
Пад Іслаччу сасновых
Вяду я гутарку без слоў
Жніўнёвую
З зямлёй, што нібы хлеб
Духмяная.
Я селянінам тут
І панам.
Няма мяжы
Між словам і задумай,
Вецер бяжыць
З блакітным шумам,
Вавёркай сонечнай
Па верхавінах скача,
Змяню на радасць
Свае плачы.
Падхоплівае жаль мой сіні
вецер.
Каб разнесці
Па шырокім свеце.

* * *

Тут хочацца задумацца
Над лёсам,
Падзякаваць
Зямлі,
нябёсам,
людзям
За цішыню,
за сонца
і за зелень,
І за звычайнае лясное зелле.
Не так даўно
Прайшло Купалле
Тут па лесе,
Яшчэ звініць у кронах
Яго песня.
Язычнік я —
Малюся дрэвам,
Каб вечна ў іх
Звінелі спевы
І каб я роўны быў
З казяўкаю ці птушкай,
Хай радасць гушкае мяне
І я каб радасць гушкаў.

* * *

Тут кожная сасна
Сонца ў руках трымае
І нам яго як хлеб
Гасцінна дорыць,
Ідзем і цешымся,
І забываем,
Што ёсць на свеце горыч.
І верым добрым чарадзеям,
Прыхільным і зычлівым
Гномам,
Чаго не ўмелі ўчора,
Сёння тут умеем.
І гэты лес становіцца
Нам домам.
Зацерлі мы мяжу
Паміж магчымым —
немагчымым,
Трымаем сонцы цёплыя
Пад пахай,
Усё змяніла
Ціхая Радзіма
І боль ужо не боль,
І жах — ужо не жахам.

http://sinyavokaya.ru

Ці можна выразіць любоў да сваёй радзімы больш пранікнёна, чым гэта робіцца праз вершы? Пэўна, не. Таму сярод знакамітых і не вельмі знакамітых беларускіх паэтаў няма ніводнага, які б не прысвяціў вершаваных радкоў Беларусі. Дзеля таго, каб мець усе вершы аб Беларусі разам, відаць, і ўзнік у інтэрнэце сайт „Вершы пра Беларусь", які месціцца па адрасе http://sinyavokaya.ru.

Насамрэч дадзены сайт з'яўляецца адным з праектаў згаданага раней на ніўскіх старонках „Нацыянальнага паэтычнага партала" і мае шмат у чым аднолькавую з іншымі праектамі-сайтамі будову. Разам з тым, адным з відавочных адрозненняў на ім з'яўляецца выява герба „Пагоня", абвітага бел-чырвона-белай стужкай, які месціцца ўверсе цэлага выяўлення на фоне неба і аблокаў.

На першы погляд сайт не мае многа рубрык. Над яго назвай мы ўбачым толькі выйсці на галоўную старонку, старонкі „Нашы праекты" і „Зваротную сувязь". Але з правага боку маецца вялікі пералік імён паэтаў, які таксама з'яўляецца выйсцем на старонкі з іх вершамі аб роднай зямлі.

Што ж тычыцца галоўнай старонкі, то яе ўпрыгожваюць тры партрэты найзнатнейшых беларусаў — Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Пададзеныя ніжэй загалоўкі вершаў з'яўляюцца выйсцямі да старонак гэтых літаратараў. Таксама на галоўнай старонцы надрукаваныя вялікімі літарамі імёны і прозвішчы дзевяці іншых паэтаў, якія, на думку аўтараў сайта, вартыя вылучэння з агульнага вялікага спісу.

Яшчэ ніжэй месцяцца шэсць вершаў, якія, па версіі ўладальнікаў партала, найлепшыя за астатніх. Так гэта ці не, кожны інтэрнэт-карыстальнік можа вызначыць самастойна, азнаёміўшыся як з гэтымі, так і з іншымі творамі на сайце. Але адносна аднаго з вершаў, якія стаяць на галоўнай старонцы, цяжка не пагадзіцца, што ён сапраўды варты размяшчэння там. Гэта ўрывак з паэмы Якуба Коласа „Сымон-музыка": „О, край родны, край прыгожы!/ Мілы кут маіх дзядоў!/ Што мілей у свеце божым/ Гэтых светлых берагоў,/ Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,/ Дзе бары-лясы гудуць,/ Дзе мядамі пахнуць грэчкі,/ Нівы гутаркі вядуць;/ Гэтых гмахаў безгранічных/ Балатоў тваіх, азёр,/ Дзе пад гоман хваль крынічных/ Думкі думае прастор;/ Дзе увосень плачуць лозы,/ Дзе вясной лугі цвітуць,/ Дзе шляхом старым бярозы/ Адзначаюць гожа пуць?".

Варта адзначыць, што распрацоўнікі сайта парупіліся і аб тым, каб карыстальнікам лягчэй было знайсці верш з тым ці іншым словам, калі, напрыклад, яны забылі яго назву і аўтара. Для гэтага ўверсе выяўлення месціцца акенца пошуку.

Рубрыка „Зваротная сувязь" з'яўляецца месцам, дзе карыстальнік можа пакінуць сваё пытанне ці заўвагу праз электронную пошту. Праўда, каму менавіта варта адрасоўваць свае электронныя лісты на сайце не паведамляецца — нават у гэтай рубрыцы мы не знойдзем ані імён, ані прозвішчаў яго аўтараў ці ўладальнікаў.

Дарэчы, пакінуць свой водгук можна і на кожны верш, змешчаны на сайце. Праўда, зрабіць гэта могуць толькі аўтарызаваныя карыстальнікі, але якім чынам трэба праходзіць гэтую аўтарызацыю высветліць не ўдалося.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Па мішэнях!

Як хутка ляціць час. Здавалася, зусім нядаўна радаваліся поспехам беларускіх біятланістаў на алімпіядзе ў Ванкуверы, а вось ужо стартаваў новы сезон і гучыць каманда трэнераў „Па мішэнях!". Планка, узнятая прызёрамі гульняў у Канадзе Дар'яй Домрачавай і Сяргеем Новікавым настолькі высокая, што дацягнуцца да яе зноў будзе вельмі цяжка. Гэта паказаў ужо першы этап Кубка свету, што прайшоў у шведскім Эстэрсундзе. У мужчынскім біятлоне ёсць зараз два прэтэндэнты на Крыштальны глобус. Гэта нарвежцы Эміл-Хегле Свендсан і Уле-Эйнар Б'ёрндален. Першы адразу выйграў 20-кіламетровую дыстанцыю, а ветэран Б'ёрндален паказаў вышэйшы клас у гонцы пераследу. Цікава, што ўнікальны біятланіст паспяхова выступае і ў лыжных гонках і мае намер перамагаць адразу на двух франтах. У беларускай камандзе на ролю лідара паслядоўна выходзіць малады Яўген Абраменка. Ужо трэці год ён прагрэсуе, на першым этапе паўтарыў сваё лепшае дасягненне ў кар'еры — 19-я пазіцыя ў гонцы пераследу. Іншыя стартавалі куды горш і, трэба думаць, асаблівых поспехаў ад беларускіх страляючых лыжнікаў у бліжэйшы час чакаць не варта. Відавочна, што пара завяршаць кар'еру Рустаму Валіуліну. Праўда, рэзерв у плечы не падпірае. Акрамя Абраменкі і Валіуліна, у беларускай заяўцы таксама вопытныя Сяргей Новікаў (герой Ванкувера пачаў сезон зусім няўдала) і Аляксандр Сыман. Наўпрост скажам — зусім не густа. Што датычыць іншых дружын, то доўга не могуць выйсці з крызісу немцы і расіяне, а вось самая доўгая лаўка рэзерву менавіта ў Нарвегіі.

Іншая справа з маладой Дар'яй Домрачавай. Новы сезон павінен даць адказ — ці зможа яна ўздымацца на новыя вяршыні, ці знойдзе псіхалагічную ўпэўненасць, урэшце ці перастане блытаць мішэні і лёжку са стойкай? Самую першую гонку ў Швецыі на 15 км Дар'я праваліла — ажно 5 промахаў і толькі 35-е месца. Аднак, услед рэабілітавалася і з адным недакладным стрэлам і хуткай хадой заваявала бронзавую пазіцыю ў спрынце. Так што адказы на пытанні яшчэ наперадзе. За беларускую жаночую каманду зараз будуць выступаць таксама Людміла Калінчык, Надзея Скардзіна, Ала Тоўкач, Надзея Пісарава і Вольга Назарава. У жаночым біятлоне надзвычай вострая канкурэнцыя — немкі, шведкі, расіянкі, французанкі шырокім фронтам прэтэндуюць на п'едэстал. З зорак не стартавала пакуль немка Магдалена Нойнер, якая залечвае траўмы. Затое „выстраліла" фінка Кайса Мякярайнен. Кола прэтэндэнтак на трон зараз сапраўды вельмі вялікае.

Не абышлося ўжо і без скандалу ў айчынным біятлоне. Рэч у тым, што федэрацыя пастанавіла запрасіць выступаць за Беларусь двух расійскіх прадстаўнікоў — Аляксандра Бабчына і Надзею Пісараву. Аднак, калі пра гэта пастфактум даведаўся Саюз біятланістаў Расіі, грымнуў гром. Чорная кошка паміж суседзямі прабегла ўжо даўно — у свой час беларусы не падтрымалі расіян у важным галасаванні, вось тыя і пакрыўдзіліся. З тае пары канфлікт толькі паглыбіўся. Нягледзячы на пратэсты, „украдзеная" Пісарава ўжо выступіла за беларускую каманду. Толькі ці так яна ёй патрэбная, колькі ўжо было такіх „залётных птушак", ды толку мала. Так што заганная практыка запрашання легіянераў працягваецца. Што датычыць згаданага Бабчына, то за яго зараз ідзе асобная вайна.

Праграма змагання за Кубак свету будзе складацца ўсяго з 9 асобных этапаў, а таксама чэмпіянату свету, які пройдзе ў сакавіку ў расійскім Ханты-Мансійску.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Цікавы будынак

Пётр БАЙКО

У Белавежы многа цікавых драўляных будынкаў, якія сваёй архітэктурай міжвольна прыцягваюць зрок турыстаў. Адным з такіх будынкаў несумненна з'яўляецца дом былой, даваеннай управы гміны Белавежа. Знаходзіцца ён у Крыжах — даўняй вёсцы, а зараз раёне гэтага мястэчка. Збудавалі яго ў 1928 годзе. Зараз ён абазначаны нумарам 4.

Фота Тамаша Няходы

Урачыстасць адкрыцця і асвячэння новаўзведзенага будынка адбылася 1 верасня 1928 года, познім вечарам. Удзельнічаў у ёй тадышні беластоцкі ваявода Караль Кірст, які менавіта закончыў трохдзённую інспекцыю Бельскага павета. Зразумела, што найперш адбылася цырымонія прывітання паважанага госця прадстаўнікамі мясцовых улад — войтам Янам Сацам і дырэктарам Дырэкцыі дзяржаўных лясоў у Белавежы Антонам Сымам, а таксама грамадствам. Затым, пад гукі аркестра пажарнай каманды, ваявода падаўся ў ваколіцу будынка гміны, дзе адбылася цырымонія асвячэння. На заканчэнне ваявода выступіў з прамовай, затым усе ўдзельнікі ўрачыстасці зрабілі супольны памятны здымак. Дырэктар А. Сым запрасіў гасцей на багаты пачастунак у казіно Дапрызыўной падрыхтоўкі леснікоў у палацавым парку. Ваявода прабываў тут коратка, таму што яшчэ гэтай ноччу быў вымушаны вярнуцца ў Беласток.

Гмінная ўправа ў будынку працавала да выбуху II сусветнай вайны. У верасні 1940 года савецкія ўлады адчынілі ў ім спецыялізаваную агульнаадукацыйную школу для глуханямых дзяцей. Пасля вайны, у саракавых гадах, размясціўся тут на нейкі час дзетсад, які дзейнічаў незалежна ад дзетсада на Стачку (раёне Белавежы). Потым будынак стаў жылым домам. Адным з больш вядомых яго жыхароў быў Аляксандр Гіголь (1905-1982) — першы ў Белавежы разьбяр драўляных фігурак зуброў, адзін з пачынальнікаў белавежскай сувенірнай справы.

СМЕЦЦЮ — НЕ!

Фота Міраслава ЗДРАЙКОЎСКАГА

Зараз белая пасцелька прыкрые зямлю, але вясною, калі снег зыдзе,пабачым у нашых лясах рознае. Людзі без ніякага сораму выкідваюць усё, нават у самых прыгожых месцах. Як так можна? **Дбайма пра наш краявід.**

Міраслаў ЗДРАЙКОЎСКІ

ЧОРНА-БЕЛЫЯ ДУМКІ

Беласток

Прызабыты дашок

У Беластоку ля скрыжавання вуліц Васількоўскай, 27 Ліпеня і Андэрса знаходзіцца прыпынак аўтобусаў гарадской камунікацыі №№ 3, 6, 9 і 13. На ім стаяць два дашкі — стары і новы. Той стары ўжо прызабыты і занядбаны. Дашок на слупах, ды і тыя слупы запыленыя, брудныя. Лавачка паламаная. Збоку гэтай віяты даўней паставілі кіёск, памаляваны чырвонай фарбай. Мае ён зачыненыя аканіцы ды дзверы (апошнія замкнутыя на вялізны замок). Сцены гэтага кіёска завэдзганы разнаколернымі надпісамі. Будку-кіёск пара ліквідаваць. Яна толькі псуе выгляд прыпынку.

Варта, каб дырэкцыя беластоцкай гарадской камунікацыі паклапацілася пра вонкавы выгляд прыпынкаў.

(яц)

Міхалова

Яны — найлепшы прыклад для маладых шлюбных пар

Нядаўна 15 пар з Міхалоўскай гміны святкавала 50-годдзе шлюбнага жыцця. Урачыстасць адбылася ў новай зале шлюбаў у Гарадской управе ў Міхалове (Беластоцкі павет). Паўвеку разам пражыць гэта — як кажуць — не поле прайсці.

Медалі за „Шматгадовае шлюбнае жыццё" атрымалі, між іншым, Ян і Таццяна Багнюкі, Мікалай і Галіна Багнюкі, Аляксандр і Яўгенія Ціванюкі, Мікалай і Ніна Горбачы, Аркадзь і Анна Грыцы, Сцяпан і Галіна Ярмолікі, Фёдар і Галена Клімовічы, Уладзімір і Анна Міхалюкі ды Мікалай і Марыя Міруці.

Падчас урачыстасці панавала мілая цёплая атмасфера. Бурмістр Марк Назарка ўручыў юбілярам памятныя граматы і кветкі. Сярод мноства пажаданняў былі зычанні добрага здароўя ды дачакання дыяментавых угодкаў.

Адгаданка

1. народны танец лезгінаў, 2. першая, самая моцная самагонка, 3. яйцо, 4. пасярэдзіне жывата, 5. адкрытая Калумбам, 6. майстар па вырабе глінянай пасуды, 7. тонкае ліставое жалеза, 8. перамяшчэнне на нагах, 9. частка сушы, якая вострым вуглом выходзіць у мора, 10. прадстаўнік манапалістычнага капіталу, 11. водгалас, 12. хваробатворчая бактэрыя ў выглядзе палачкі.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Мігеля Сервантэса. **(ш)**



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 45 нумара

Аазіс, акцыя, жыццё, Пенза, сець, тычына, хіцін, ява, Яік.

Рашэнне: **Ёсць святыя, якіх жыцце пачынаецца з кананізацыі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** і **Міхалу Байко** з Беластока.

12.12 — 18.12

(22.03. — 20.04.) 12-16.12. маланкава ўдасца табе рэгенераваць. Узмоцніш не толькі свае сілы, але і становішча. Твае аргументы пераканаюць кожнага. Хопіць табе сілы і нават адчаю ў дзеяннях. Узрасце тэмпература пачуццяў. Думай перш за ўсё аб сабе.

(21.04. — 21.05.) Будзе хапаць поспехаў, радасных падзей і вельмі мілых хвілін у пары. Хоць Уран з 16.12. (да 20.12.) ускладніць твае стасункі з шэфам (можа адчуць, што ўваходзіш у яго кампетэнцыі). Могуць цябе найбліжэйшыя задзівіць так, што анямееш або страціш апетыт.

(22.05. — 22.06.) 12-16.12. можаш разгадаць нейкую таямніцу. Пільнуй дэталяў і ўсіх інфармацый (штосьці, здавалася б, малаважнае можа аказацца вырашальным). Галава поўная ідэй, але наўрад ці ўдасца іх цяпер зрэалізаваць, бо могуць прытрапіцца вельмі неспрыяльныя акалічнасці.

(23.06. — 23.07.) Не бойся марыць і прабаваць рэалізаваць далёкія планы. Але пакуль поўнай парай займайся самым важным. Можаш нават узяць пару дзён адпачынку. Ідзі ўперад, прымаючы пад увагу высновы з таго, што адбылося раней. У пачуццях паддайся магіі хвіліны.

(24.07. — 23.08.) З 16.12. (да 20.12.) паявіцца неспакой. Калі штосьці цябе заспеее, можаш пераборшчыць у рэакцыі. Перад тваёй праніклівасцю нішто не схаваецца. Зоркі падкінуць табе мноства энергіі. Ахвотна возьмешся за заданні, якія могуць перарасці твае сілы (пільнуйся з дэкларацыямі, бо ўкапаешся!).

(24.08. — 23.09.) 12-16.12. будзеш моцны, прадпрымальны, хоць таксама і запальчывы. Добры час, каб пазмагацца за сваё. Пераканаеш да сваіх рацый нават заўзятых праціўнікаў. Шанц, каб перадумаць і зрабіць карэктуру сваіх планаў. Пераможаш дзякуючы зыркасці і засяроджанню.

(24.09. — 23.10.) Спешка, бегатня, афармлянне розных спраў у апошнюю хвіліну. Удасца ўсё ж усё скантраляваць і ўсё давесці да добрага канца. Добра расплануеш выдаткі, вернуць табе стары доўг. Твой добры настрой папсуе ўспамін аб былой паразе (12-16.12.).

(24.10. — 22.11.) Будзеш мець аграмадную сілу, ды ці выкарыстаеш яе адпаведна? Венера будзе лагодзіць твой тэмперамент. Засяродзься на зараблянні грошай. Варта схадзіць да касметолага — вынік кіне кампанію на калені!

(23.11. — 22.12.) Будзеш не вельмі пастаянны ў пачуццях. Сустрэчы могуць закончыцца па 1-2 разе, у пары таксама могуць прытрапіцца расчараванні. 14-18.12. можа табе здавацца, што ўсе з табою лічацца, аднак рэальнасць можа быць далёкая ад тваёй фантазіі. Са здароўем няблага, толькі добра высыпайся, схадзі ў кіно, пачытай добрую кнігу.

(23.12. — 20.01.) Дзейнічай смела, а шмат здабудзеш — на ляноту можаш дазволіць праз тыдзень. Пераканаешся, што любоў гэта не толькі высокія словы і ўзлёт пачуццяў (жывем жа ў шэрай рэчаіснасці); пераканаешся, што мілы жэст больш варты ад тысячы прыгожых слоў. Можаш здабыць сэрца асобы, якая здаўна табе падабаецца.

(21.01. — 19.02.) З 16.12. (да 20.12.) можаш нарабіць бязглуздзіцы з-за сваёй упартасці. Тупанне ножкай і бунт для бунту нікому не імпануюць. Рэальна абдумай былое, без істэрыкі і пераўвелічэння параз. Палічы гэта ўрокам і ідзі далей.

(20.02. — 21.03.) З 16.12. (да 20.12.) моцна павялічваюцца твае шанцы на поспех. Прыхільнасць шэфа — дзякуючы тваім ідэям і прылюднасці. Ужо цяпер пазмагайся за сваё павышэнне. Рыбы народжаныя пасля 15.03. маюць шанц пазбыцца шкодных звычак і паспяхова ўзяцца за змаганне з імі.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

ZUBROFFKA
MIĘDZYNARODOWY FESTIWAL FILMÓW KRÓTKOMETRAŻOWYCH

: кірунак — вялікі свет

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Кай фон Вестэрман, аператар і рэжысёр, прыехаў з Бона, каб працаваць у журы сёлетняга фестывалю. Побач яго конкурсныя фільмы ацэньвалі мантажыстка Магдалена Мікалайчык, Юры Каліна — дакументаліст Беластоцкага асяродка Польскага тэлебачання і тэлеканала Белсат ды Корнэль Міглюс — старшыня камісіі, рэжысёр, працаўнік Польскага інстытута ў Берліне. Міжнароднае журы гэта эфект шырокага супрацоўніцтва і шматлікіх кантактаў у Еўропе, якія завязваюць арганізатары фестывалю. Мае гэта таксама адлюстраванне ў фармаце фестывалю. 67 фільмаў, пяць катэгорый, дзевятнаццаць розных прызоў і галоўнае — Гран-пры фестывалю. Каб размеркаваць іх усіх, журы мусіла праседзець перад экранам каля трынаццаці гадзін. Як сказаў мне адзін з гледачоў і сябра фестывалю Міхал Сломка з Познаня, вердыкт супярэчным назваць нельга.

Журы перш за ўсё належным чынам ацаніла важныя тэмы, якія паяўляліся ў фільмах. Таму, між іншым, Гран-пры ўзяў фільм „Бабінае лета" Мацея Цэндроўскага, які паказвае цяжкасці перыяду даспявання маладых людзей. У галіне дакумента (цікава, што і галасамі публікі таксама) вылучэнне атрымаў фільм Мацея Главінскага „Да дна". Аб'яўляючы гэтую ўзнагароду, Юры Каліна падкрэсліў як важныя для адлюстравання рэчаіснасці з'яўляюцца дакументальныя фільмы. У фестывальнай праграме іх няшмат, але не праходзяць яны незаўважанымі.

Зразумела, апрача тэмы патрэбная яшчэ адпаведная форма і сродкі, праз пасрэдніцтва якіх распавядаецца гісторыя.

— Тым прайграла аўтарка беларускага фільма „Права на смерць" (Кацярына Севасцьянава), — каментуе Кай фон Вестэрман. — Закранула яна вельмі важную тэму аховы жывотных у Беларусі. Я таксама быў вельмі парушаны, але сродкі, якімі пакарысталася, дысквалiфікавалі яе да якой-небудзь узнагароды. Азербайджанская „Спадчына", хаця з відавочнымі тэхнічнымі недахопамі, была сапраўдным дакументам, таму вырашылі даць яе аўтару (Фарыз Ахмедаў) першую ўзнагароду.

Другі беларускі фільм, які паявіўся ў рамках конкурсу — у той жа самай катэгорыі „Акно на Усход" — „Мініяцюры" Яўгена Сысоева, атрымаў трэцюю ўзнагароду. Паявіліся галасы з боку журы і публікі, што гэта не да канца фільм. Можа хутчэй відэа-арт, прадукцыя з памежжа жанраў, у якой усё ж такі відаць задумку.

— Вельмі мяне цешыць прыз для Яўгена, бо сачу за яго працамі ўжо здаўна, — расказвае Арцём Лобач, аўтар фільмаў з Беларусі, якія ў мінулых гадах таксама прэзентаваліся на фестывалі. — Эксперыментуе з формай, але гэта таксама вынік яго шматгадовых пошукаў. Вельмі важная ў яго прадукцыях якасць так цэлай карцінкі, як і яе паасобных элементаў. Напэўна так кампетэнтнае журы гэта заўважыла.

„Акно на Усход" гэта толькі частка фестывалю „ŻubrOFFka", але ў ацэнцы гасцей падкрэсліваецца найважнейшую місію фестывалю якраз у гэтай галіне дзейнасці.

— У гэтым бачу найбольшую вартасць фестывалю, — тлумачыць Кай фон Вестэрман. — Апрача таго, што я захоплены атмасферай фестывалю, людзьмі, якіх тут сустракаю, то бачу, што маеце здольнасць гаварыць з Усходам. Трэба гэтае выкарыстаць. Дзякуючы „ўсходняму агляду" відаць і адметнасць фестывалю на фоне іншых. У параўнанні з тым, што бачым на захад ад Польшчы, што прэзентавалася ў катэгорыі „Цэлы гэты свет", я б сказаў, што ўсходнія аўтары яшчэ ў пошуках, падчас калі заходнія ўжо насычаны. Мяне ўражвае свежасць погляду. Лічу, што аматар нічога не мусіць, таму заахвочваю ўсіх, каб у сэрцы заставаліся аматарамі, нават, калі яны ўжо здаўна прафесіяналы.

Журы фестывалю ў час „Сняданку майстроў" у кавярні „Капілювак"

— У Нямеччыне можаш сустрэць у краме гарэлку „Grasovka". Смешна, праўда? Вядома, што і так яна ўсім асацыюецца з арыгінальнай „Зуброўкай", бо і на тым самым засяроджваецца яе адметнасць. Проста, назва прыдумана на нямецкі рынак.
З Каем фон Вестэрманам сустракаемся ў першы дзень фестывалю. Расказ пра гарэлку гэта нямецкая імпрэсія ў кантэксце шматлікіх пытанняў ці фестываль „ŻubrOFFka" спансаруе вытворца папулярнага спіртнога напітку.
— Не, не спансаруе, — адказвае Мацей Рант, галоўны арганізатар мерапрыемства з Беластоцкага асяродка культуры.
— Але і без іх дапамогі развіваем крылы — смяецца.

Уручэнне Гран-пры рэпрэзентанту Мацея Цэндроўскага

Міхал Сломка з Фонду „Транзіт" з Познаня, дзе ладзіцца таксама незалежны кінафестываль, у гэтым усходнім ухіле бачыць вялікія магчымасці прамоцыі „ŻubrOFFki".

— Гэта абавязак арганізатараў, каб выбар фільмаў паказваць шырэй. Можа нават варта, каб фестываль вырас накшталт „Спутніка". Ясна, што „Спутнік" больш камерцыйны, але яго маштабнасць можа быць узорам і будучыняй „ŻubrOFFki". Гавару гэта без зайздрасці, бо вартасцю такіх фільмавых сустрэч з'яўляецца тое, што пазнаем шмат новых, адкрытых людзей. Праўда, займаемся гэтым самім у розных месцах, але не канкуруем, хутчэй дапамагаем сабе ўзаемна.

Міхал прыехаў на фестываль не толькі паглядзець фільмы і наведаць сяброў, але таксама прывёз выбар фільмаў са свайго фестывалю „Транзіт". Прэзентаваў іх у Гмінным асяродку культуры ў Чаромсе.

— Прыйшло толькі трынаццаць чалавек, але хацелі глядзець, а пасля гаварыць пра пабачаныя фільмы. Ведаю як складана ў малых асяродках пераканаць людзей да незалежнай культуры. Нягледзячы на гэта, будзем ладзіць з Чаромхай супольны праект, — гаворыць Міхал.

Гэта адзін з канструктыўных вынікаў фестывалю, але самыя паказы фільмаў у рэгіёне прайшлі ў рамках фестывалю ўжо не першы раз. Зараз, аднак, колькасць месц, фільмаў і гасцей пабольшылася: Гарадок, Саколка, Сейны, Чаромха, Супрасль. Да гэтага паказы ў розных пляцоўках Беластока, у тым ліку сустрэча з фільмамі сяброў журы („Сняданак майстроў"). Усё разам упрыгожанае клубнымі музычнымі прэзентацыямі ў сярэдзіне „начной цішыні", ужо пасля ўсіх кінапаказаў.

Фестываль у тым фантастычны, што жыве не толькі ў кінатэатры „Форум", але, здаецца, можна пры ім яшчэ папрацаваць, каб нарэшце цэлы горад жыў гэтым мерапрыемствам. Гэтага бракуе, але ў перспектыве можа так быць, — падводзіць фестываль беластачанка, пастаянная наведвальніца фестывалю.

— Здзівіла мяне, што сустрэтыя ў бары іспанцы зусім не ведалі, што праходзіць у Беластоку фестываль, на якім якраз у гэтым годзе можна было пабачыць сапраўды многа іспанскага кіно, — дадае Арцём Лобач. — Не абвінавачваю ў гэтым арганізатараў, бо ведаю, колькі ў іх працы, але, відаць, трэба яшчэ папрацаваць пры прамоцыі фестывалю, які лічу адным з цікавейшых у Польшчы.

Зубр здавён-даўна асацыюецца з Падляшшам. У Беластоку з'явіўся вялікі шанс, каб прыдаць зубру новае значэнне, памяняць кантэкст, ад сімвала пушчы перайсці да сімвала незалежнай культуры. Ці фестываль „ŻubrOFFka" зможа выпрамаваць сябе і зубра ў свеце ў будучыні? Ці стане культурнай маркай, а зубр стане жыць новым жыццём? Пра гэта яшчэ пераканаемся, бо пяць выпускаў Міжнароднага фестывалю кароткаметражнага кіно „ŻubrOFFka", якія ўжо за намі, гэта толькі пачатак. Ёсць буйныя планы, як з беластоцкага „OFF"-фестывалю зрабіць вялікае мерапрыемства, не толькі ў маштабе рэгіёна. Чакаем тады шостага выпуску.

ISSN 0546-1960